№ 39 (541) 25 кастрычніка 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Сурадзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі




## У НУМАРЫ

**Бяроза падае прыклад**

Упершыню за дзесяць гадоў у Бярозе зьявілася першая беларускамоўная кляса.
**Старонка 2.**

**Антысэмітызм ці ляпсус?**

Рэпліка Лукашэнкі ледзь не прывяла да адкліканьня ізраільскага пасла зь Беларусі.
**Старонка 7.**

**Камандзіроўка ў Бабруйск**

Пра Сарказі і антысэмітызм піша Віталь Тарас.
**Старонка 8.**

**Японскі ход**

Лукашэнка запрасіў Японію да супрацы ў пабудове АЭС. Шушкевіч: гэта вельмі дарага. **Старонка 6**.

**Віктар Івашкевіч: «Я не займаюся інтрыгамі»**

БНФ пагрузіўся ва ўнутрыпартыйную барацьбу зь пераходам на асобы.
**Старонка 10.**

**Яны на практыку ўзяты цягаць цяжкія камяні**

Рабская праца ў нас на вачах, і ўсе... звыклыя.
**Старонка 12.**

**Габрэй-эсэсавец наведаў Менск**

Дзіўная жахлівая гісторыя.
**Старонка 16.**




**Паляні ўзялі рэкордны ўдзел у галасаваньні, зьмянілі кансэрватараў на лібэралаў. Прыхільнікі Лукашэнкі страцілі месцы ў Сойме. Старонка 3.**

### Рэдактары «Нашай Нівы», «ARCHE» прыедуць у Горадню

У горад над Нёманам прыедуць галоўны рэдактар газэты «Наша Ніва» Андрэй Скурко, галоўны рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў, паэт Андрэй Хадановіч, да іх далучыцца крытык, аўтар «НН» Даніла Жукоўскі. **Чацьвер, 25 кастрычніка, 18:30. Памяшканьне «Таварыства беларускай школы» (Будзённага, 48а).**

### На зімовы час

Завяршаецца «летні час». Традыцыйна гэта прыпадае на апошнюю нядзелю кастрычніка. У ноч на 28 кастрычніка а 3-й ночы стрэлкі гадзіньнікаў ва ўсёй Беларусі пераводзяцца на адну гадзіну назад.

### Ня стала прафэсара Лойкі



21 кастрычніка на 64-м годзе жыцьця памёр доктар гістарычных навук, прафэсар, загадчык катэдры дыпляматычнай і консульскай службы факультэту міжнародных адносінаў Белдзяржунівэрсытэту Леанід Лойка. Пахаваны Л.Лойка ў Смалявічах.

## Шэсьце ў Дзяды

Традыцыйнае шэсьце на Дзяды, што ладзіць КХП — БНФ, пройдзе ў нядзелю 28 кастрычніка ад Гадзіньнікавага заводу (мэтро «Парк Чалюскінцаў»). Пачатак аб 11-й. Праспэктам дэманстранты пройдуць ва ўрочышча Курапаты, дзе ад 14.00 па 17.00 адбудзецца мітынг. Акцыі дазволіў Менгарвыканкам.

У Курапатах дагэтуль застаецца шмат месцаў расстрэлаў, не пазначаных крыжамі. Грамадзяне, што жадаюць усталяваць ва ўрочышчы крыж, могуць зьвяртацца да сакратара Ўправы КХП — БНФ Алеся Чахольскага, які прымае ахвяраваньні. На атрыманыя сродкі будуць выраблены крыжы, а ахвярадаўцы змогуць іх усталяваць у Курапатах. Кантактны тэлефон: (029) 124-46-86.

**СП**

# Пэнсія мары

Беларусы сасьпелі да пэнсійнай рэформы — такую выснову можна зрабіць на падставе аналізу грамадзкай думкі, праведзенага Дасьледчым цэнтрам ІПМ.

«У Беларусі сасьпеў час для падвышэньня пэнсійнага ўзросту — гэтага хочуць самі пэнсіянэры», — заявіў Аляксандар Лукашэнка 12 кастрычніка ў часе прэсавай-канфэрэнцыі для расейскіх журналістаў. Парадаксальнае на першы погляд, гэтае выказваньне нясе ў сабе рацыянальнае зерне. Як сьведчыць апошняе дасьледаваньне, праведзенае Дасьледчым цэнтрам ІПМ, беларусы сапраўды маральна сасьпелі для пэнсійнай рэформы. Іншая справа, што пад рэформай яны разумеюць паступовы пераход ад разьмеркавальнай да ашчаджальнай пэнсійнай сыстэмы. А што да пэнсійнага ўзросту, дык ня ўсе вераць, што дажывуць да яго.

**Працяг на старонцы 21.**

# Упершыню за дзесяць гадоў у Бярозе

Алег Лабовіч — бацька двух сыноў: Алёшы і Янкі. Янку тры гады, а Алесіку шэсьць. Бацька заўсёды хацеў, каб сын вучыўся ў беларускай клясе. Але са зьдзіўленьнем даведаўся, што ў Бярозе няма такіх.

Спадар Алег зьвярнуўся зь лістом да начальніка раённага аддзелу адукацыі А. Курыловіча. У адказах было напісана, што ўсе гарадзкія школы зьяўляюцца расейскамоўнымі «паводле жаданьня бацькоў», і таму, «калі будзе жаданьне і заявы бацькоў з мэтай выхаваньня і навучаньня дзяцей у беларускамоўных клясах школы, аддзел адукацыі будзе спрыяць іх адкрыцьцю».

Тады сп. Лабовіч зьвярнуўся зь лістом у Таварыства беларускай мовы. Там яму параілі, каб абараніць канстытуцыйнае права на свабоду выбару мовы выхаваньня і навучаньня, зьвярнуцца зь лістамі да міністра адукацыі, генэральнага пракурора і старшыні Канстытуцыйнага Суду.

Звароты ў пракуратуру і ў Канстытуцыйны Суд былі пераадрасаваныя ў Мінадукацыі. Міністэрства даручыла РАА «вывучыць пытаньне пра неабходнасьць адкрыцьця беларускамоўных клясаў у г. Бярозе… і, пры неабходнасьці, вырашыць пытаньне пра іх адкрыцьцё».

27 жніўня гэтага году ў сярэдняй школе № 2 быў сход бацькоў першаклясьнікаў, якія павінны былі пайсьці ў школу з 1 верасьня. З 130 бацькоў прысутнічала 115. Перад імі выступілі дырэктар школы, настаўніца беларускай мовы, намесьніца загадчыка РАА. Яны распавялі, як важна ў наш час валодаць ня толькі замежнаю, але і роднаю моваю.

Бацькам прапанавалі стварыць беларуска-ангельскую 1 «Г» клясу. Было пададзена 15 заяваў. Такім чынам, упершыню за дзесяць гадоў у Бярозе зноў зьявілася першая беларускамоўная кляса.

Умовы для 1-й «Г» створаныя нават трошкі лепшыя, чым для астатніх. Яна адзіная зь сямі першых клясаў разьмешчаная ў самой школе (астатнія ў дзіцячых садках). Большасьць вучняў знаходзяцца ў школе да 18.00. Тут яны і сьпяць, і харчуюцца.

Вядзе клясу маладая настаўніца Віталія Кавальчук. Яна скончыла Баранавіцкі вышэйшы пэдкаледж па моўнай спэцыяльнасьці. Апошнія тры гады вяла фізкультуру і сёлета, нарэшце, дачакаўшыся чаргі, атрымала клясу.

Беларускія падручнікі ў школе ёсьць. Праўда, недахоп у кніжках-чытанках, падручніках для дадатковага навучаньня, картках, плякатах, бо беларуская кляса створаная літаральна перад пачаткам навучальнага году.

Дзеткі асвойваюць мову і прывучаюць да яе бацькоў. Хоць амаль усе яны зь беларускіх сем'яў (толькі адзін хлопчык з расейска-армянскай), аднак і ў сям'і, і ў дзіцячым садку большасьць жыве ў расейскамоўным асяродку.



**Алег Лабовіч**

нарадзіўся ў 1976 г. Сам вучыўся ў беларускамоўнай Сакалоўскай школе. Скончыў Берасьцейскі дзяржаўны тэхнічны ўнівэрсытэт. Працуе ў ААТ «Бярозаўскі маторарамонтны завод», інжынэр-канструктар.

**Сяржук Русецкі, фота аўтара**

# Новы твар Польшчы

Польскія выбарцы ўзялі рэкордны ўдзел у галасаваньні, зьмянілі кансэрватараў на лібэралаў. Страцілі месцы ў Сойме і прыхільнікі Лукашэнкі.

Польшча можа разьлічваць на ўзмацненьне аўтарытэту ў Эўропе. Партыя Яраслава Качыньскага «Закон і справядлівасьць», што праводзіла канфрантацыйную палітыку абароны нацыянальных інтарэсаў, страціла ўладу. На зьмену прыйшлі энтузіясты эўраінтэграцыі і прыхільнікі пабудовы адкрытага грамадзтва — лібэралы з «Грамадзянскай плятформы».

Палітыка Польшчы да Беларусі ня зьменіцца — хіба выканаўцы. Дагэтуль яе акрэсьліваў дарадца прэм’ера, былы пасол Польшчы ў Беларусі Марыюш Машкевіч.

Беларускія ўлады разьлічваюць скарыстацца зь пераменаў на польскім палітычным алімпе і паправіць адносіны. Камэнтары афіцыйных СМІ да вынікаў выбараў асьцярожна-аптымістычныя. Гэта пры тым, што Дональда Туска, лідэра «Плятформы», нядаўна не пусьцілі ў Беларусь.

Вострая спрэчка кансэрватараў Качыньскага і лібэралаў Туска палітызавала Польшчу, і галасаваць прыйшла рэкордная колькасьць выбарцаў — аж 55 %. Зь іх 41 % падтрымаў «Плятформу», а 32 % — партыю Качыньскага.

Туск найхутчэй сфармуе ўрад зь Сялянскай партыяй, што набрала 9 % галасоў.

Трэцім прыйшоў блёк «Лявіца й дэмакраты» на чале з былым прэзыдэнтам Польшчы Аляксандрам Квасьнеўскім (12%). Гэта намнога меней, чым спадзяваліся. Дзіва што Квасьнеўскі па абвяшчэньні вынікаў аб’явіў пра сыход з палітыкі. Ён паўплываў на выніfolні выбараў не найлепш: зьявіўся неяк выпіўшы на мітынгу, а пасьля яшчэ няўклюдна тлумачыў гэта «трапічнай трасцай».

Значны ўплыў на Польшчу будзе мець сыход з палітычнай сцэны крайне правай і крайне папулісцкай палітычных сілаў — ультракаталіцкай Лігі польскіх сем’яў і народніцкай Самаабароны. Іх лідэры сымпатызавалі А. Лукашэнку, у якім яны бачылі барацьбіта супраць Захаду і эўраінтэграцыі. Лепэр нават прыяжджаў у Беларусь і агітаваў за Лукашэнку.

З дэпутатаў беларускага паходжаньня ў Сойм ізноў прайшоў Яўген Чыквін. Ён балятаваўся ад Лявіцы і набраў другую колькасьць галасоў па сваёй падляскай акрузе.

**БТ**

**Машкевіч: Палітыка Польшчы да Беларусі ня зьменіцца**

«Што тычыцца замежнай палітыкі ў адносінах да Беларусі, дык ніякіх зьменаў ня будзе. Тактыка, распрацаваная два гады таму, будзе працягвацца. Максымум — гэта нейкія касмэтычныя зьмены, якія будуць залежаць ад асобы міністра замежных справаў, — заявіў Марыюш Машкевіч для «Эўрарадыё».

# зьявілася беларускамоўная кляса



# Улады спадзяюцца на Рыгоні, апазыцыя глядзіць скептычна

У камандзе Рыгоні былі заўважаныя людзі з Масквы.

З 16 да 19 кастрычніка ў Менску з афіцыйным візытам знаходзіўся новы спэцыяльны дакладчык Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Андрэа Рыгоні. Гэтае месяца 45-гадовы італьянскі дэпутат заняў сёлета 13 лютага на паседжаньні палітычнага камітэту ПАРЭ. Раней пасаду спэцдакладчыка займаў эстонец Андрэас Херкель, а яшчэ да яго — кіпрыёт Хрыстас Пургурыдэс, які цяпер ня можа атрымаць дазвол, каб прыехаць у Беларусь. Даклад Пургурыдэса аб зьніклых палітыках у Беларусі быў прыняты ПАРЭ. Для Рыгоні гэты візыт у Беларусь першы.

Яшчэ да пачатку візыту шмат хто з дэмакратычных палітыкаў крытыкаваў даты прыезду італьянца, кажучы, што найлепш было пачаць візыт 14 кастрычніка, калі ў Менску адбываўся «Эўрапейскі марш». Але Рыгоні прыехаў згодна з ранейшым плянам. Штопраўда, паабяцаўшы пагаварыць пра вынікі апазыцыйнай акцыі з прадстаўнікамі ўладаў.

Доўга не было зразумела, хто ж арганізоўвае візыт Рыгоні ў Менск. Каб даведацца, мы патэлефанавалі ў сэрбскае пасольства ў Беларусі. Сэрбія цяпер старшынюе ў ПАРЭ. Першы сакратар пасольства ў палітычных пытаньнях Дарынка Ачымавіч паведаміла, што яны ня маюць зьвестак адносна візыту Рыгоні і параіла зьвяртацца ў МЗС і парлямэнт. У прэс-службе міністэрства замежных справаў сапраўды пацьвердзілі, што італьянскі парлямэнтар знаходзіўся ў Менску на запрашэньне нацыянальнага сходу.

У Менску сп.Рыгоні меў сустрэчы са сьпікерамі палат парлямэнту Вадзімам Паповым і Генадзем Навіцкім, міністрамі замежных справаў і юстыцыі Сяргеем Мартынавым і Віктарам Галаванавым, прадстаўнікамі Канстытуцыйнага суду, зь лідэрамі апазыцыі і прадстаўнікамі незалежнага грамадзтва.

У парлямэнце візыт Андрэа Рыгоні ацанілі як «вызначальны» для краіны. Некаторыя парлямэнтары спадзяюцца, што з прызначэньнем італьянца на пасаду спэцдакладчыка палата прадстаўнікоў можа вярнуць сабе статус спэцыяльна запрошанай у ПАРЭ.

Анатоль Лябедзька, які сустракаўся з Рыгоні разам зь іншымі апазыцыйнымі палітыкамі, так пракамэнтаваў візыт: «Пасьля нашай апошняй сустрэчы Рыгоні істотна вырас. Я ня маю на ўвазе рост. Ён вырас у пляне веданьня Беларусі і сытуацыі ў нашай краіне. Усё ж Беларусь вельмі далёка ад сфэры італьянскіх інтарэсаў. Чаканьні візыту былі досыць насьцярожанымі. Некаторыя аналітыкі лічылі, што гэта можа азначаць больш інтэнсіўныя камунікацыі Эўропы з афіцыйным Менскам, што прывядзе да зьмякчэньня ў стасунках. Рыгоні ж адразу выклаў сваю пазыцыю: ПАРЭ зацікаўленае ў дыялёгу зь беларускімі ўладамі, але пры ўмове, што дыялёг будзе трохбаковым, з удзелам апазыцыі. Важным зьяўляецца той факт, што Рыгоні выказаўся за правядзеньне вялікай канфэрэнцыі па Беларусі, пра гэта некалі казаў Рэнэ ван дэр Ліндэн».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**А.Рыгоні не зьбіраецца настолькі доўга займацца Беларусьсю, каб вывучаць беларускую мову.**

Павал Севярынец быў больш скептычны: «Гэта звычайная гульня рэжыму. На наступны ж дзень пасьля ад'езду Рыгоні беларускія ўлады прымаюць расейскага прэм'ера Зубкова, ідзе гаворка пра пабудову газаправоду «Ямал — Эўропа». Звычайны гандаль апошніх гадоў, але тут ён робіцца больш інтэнсіўным, стаўкі павышаюцца. Улады дазваляюць адкрыць офіс Эўракамісіі ў Менску. Але немагчыма будаваць замежную палітыку, пастаянна падманваючы, то аднаго, то другога партнэраў. Што да самога Рыгоні, то для мяне паказальным зьяўляецца выпадак, што калі я зь ім пачаў размаўляць пабеларуску, перакладчык сказаў, што не разумее. Высьветлілася, што гэты чалавек з Масквы, пасьля аказалася, што яшчэ некалькі чалавек з каманды Рыгоні з Масквы. Мяне гэта вельмі насьцярожвае. У адказ на падораную кнігу «Лісты зь лесу» сп.Рыгоні шчыра сказаў, што ён не настолькі доўга будзе займацца Беларусьсю, каб яшчэ вывучаць беларускую мову».

Прадстаўнікі грамадзкасьці на сустрэчы з Рыгоні былі зьдзіўленыя тым, што італьянец найперш цікавіўся сьмяротным пакараньнем, якое дзейнічае ў Беларусі, а не пытаньнямі палітычнага ўціску, арыштамі актывістаў, фатальным становішчам са свабодай слова. Адзначылі і заявы Рыгоні аб тым, што катэгарычнае «не» беларускім уладам ён казаць ня будзе, бо ўжо ўсе ведаюць «некаторых неўязных у Менск».

Да пачатку 2008 г. А.Рыгоні мае падрыхтаваць справаздачу па сытуацыі ў Беларусі.

**Зьміцер Панкавец**

### Расеец можа ўзначаліць Парлямэнцкую асамблею Рады Эўропы

Менавіта прадстаўнік «Адзінай Расеі» Міхаіл Маргелаў узначальвае цяпер у парадку ратацыю фракцыю Эўрапейскай народнай партыі, у якую ўваходзіць «Адзіная Расея». Гэта значыць, што паводле традыцыі акурат ён мае стаць чарговым старшынём ПАРЭ. Аднак перадаваць гэтую сымбалічную пасаду прадстаўніку недэмакратычнай краіны няёмка, таму ў ПАРЭ цяпер шукаюць працэдурных кручкоў. Дадатковую пікантнасьць дадае той факт, што Маргелаў пачынаў кар'еру як агент ФСБ, прычым пасаду ён атрымаў, лічы, у спадчыну. Ягоны бацька быў кадравым афіцэрам КДБ. Свой палітычны шлях Маргелаў пачынаў у дэмакратычным руху Расеі і актыўна ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі Ельцына ў 1996–м, працуючы ў г.зв. «чубайсаўскім штабе»

# Дэфіцыт прадуктаў ці попыт на інтэграцыю?

По вяртаньні зь Беларусі Зубкоў, пасьля дакладу Пуціну, патэлефанаваў Сідорскаму.

Ці не рыхтуецца новы подступ да беларускай незалежнасьці? Ужо сам факт першага замежнага візыту Зубкова да нас быў шматзначным — гавока ж пра наступніка Пуціна. А тут яшчэ Пуцін у часе этапнай тэлеканфэрэнцыі з народам абазначыў інтэграцыю на постсавецкай прасторы як сваю задачу нумар адзін. Невыпадкова шэф расейскай Службы замежнай выведкі Лебедзеў атрымаў прызначэньне выканаўчым сакратаром СНД — і ніводзін кіраўнік дзяржавы не пасьмеў запярэчыць.

А тут яшчэ 22 кастрычніка прэм’ер-міністар Расеі **Віктар Зубкоў** — з уласнай ініцыятывы — патэлефанаваў **Сяргею Сідорскаму**, каб абмеркаваць меры па выкананьні дамоўленасьцяў, дасягнутых у часе працоўнага візыту Зубкова ў Менск, які прайшоў тры дні таму. У часы Фрадкова такога не бывала.

Як паведамляе афіцыйны сайт беларускага ўраду, суразмоўцы «пацьвердзілі дамоўленасьць пра стварэньне сталых беларуска-расейскіх групаў па вырашэньні праблемных пытаньняў». Да праблемных пытаньняў у дачыненьнях між краінамі сёньня адносяцца энэргетычная, мытная й транспартная сфэры, пастаўка сельскагаспадарчай прадукцыі, супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі й перапрацоўчых галінах, вытворчая каапэрацыя й стварэньне супольных вытворчасьцяў.

Уздым і апэратыўнасьць, зь якой беларускі ўрад паведаміў плянэце пра гэты званок, тлумачаць тым, што ініцыятыва Зубкова патэлефанаваць Сідорскаму атрымала ўхваленьне самога Пуціна ў зьвязку з дэфіцытам на расейскім рынку прадуктаў.

«Дастаткова востра стаіць праблема стабілізацыі цэнаў… Рашэньнем гэтага важнага пытаньня паслужыць стварэньне здаровай канкурэнцыі на нашых прадуктовых рынках, у тым ліку за кошт падтрымкі каапэрацыйных ды інвэстыцыйных сувязяў у рамках саюзнай дзяржавы зь Беларусьсю», — даклаў 22 кастрычніка расейскі прэм’ер прэзыдэнту Пуціну.

**Мікола Бугай**



Сяргей Сідорскі і Віктар Зубкоў.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## СЬЦІСЛА

### Шырокі, але позьні жэст

У дзень візыту расейскага прэм’ера ў Беларусь А.Лукашэнка даў згоду на адкрыцьцё прадстаўніцтва Эўракамісіі ў нашай краіне. Яшчэ ў 2005 годзе Эўракамісія зьвярнулася да Беларусі з прапановай адкрыць самастойны офіс у Менску. Але дагэтуль пытаньне вісела ў паветры. Адказ прагучаў праз тыдзень пасьля Эўрамаршу і ў часе візыту Андрэа Рыгоні ў Беларусь.

### Беларусаў судзяць, а мовы ня ведаюць

Вярхоўны суд Беларусі пачаў разгляд скаргі на дзеяньні Мін’юсту, якое адмовілася рэгістраваць грамадзкае праваабарончае аб’яднаньне «Вясна». Праваабаронцы запатрабавалі ад Мін’юсту прадставіць дакументы на беларускай мове, а таксама весьці працэс па-беларуску. У выніку для перакладу дакумэнтаў суд прызначыў тэрмін да 25 кастрычніка.

«Вясна» была ўжо зарэгістраваная, але яе зьліквідавалі ў 2002 годзе, дачапіўшыся да нейкіх кручкоў.

### На дне

Паводле чарговага рэйтынгу свабоды СМІ міжнароднай арганізацыі «Рэпартэры бязь межаў» Беларусь, як і год таму, займае 151-е месца. На першым месцы — Ісьляндыя. Апошнія радкі за Эрытрэяй (169) і Паўночнай Карэяй (168).

### Жэст Мартынава

У Менскім міжнародным адукацыйным цэнтры адбыўся 2-і дыспут «Партнэрства эканомікі і палітыкі ў эўрапейскіх трансфармацыйных працэсах: досьвед зямлі Брандэнбург». Зь нямецкага боку ўзяў удзел прэм’ер-міністар зямлі Брандэнбург **Маціяс Плацэк,** пасол Нямеччыны **Гебхард Вайс,** а таксама прадстаўнікі Фонду. Беларусь прадстаўлялі міністар замежных справаў **Сяргей Мартынаў** і Мітрапаліт **Філарэт.** У залі прысутнічалі прадстаўнікі незалежнага грамадзтва і апазыцыйных партыяў.

### Шумкевіч на чале «Маладых дэмакратаў»

Старшынём моладзевай арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі «Маладыя дэмакраты» абраны Аляксандар Шумкевіч. Выбары адбыліся на ўстаноўчым зьезьдзе 21 кастрычніка ў Менску. Шумкевіч набраў болей галасоў (28), чым **Міхаіл Пашкевіч** (21). А.Шумкевіч — гэта той самы, каму ў Горадні зламалі руку, калі ён узьняў бел-чырвона-белы сьцяг на канцэрце.

# Японскі ход

Лукашэнка запрасіў Краіну ўзыходнага сонца да супрацы ў пабудове АЭС. Гэтую геапалітычнага значэньня заяву ён зрабіў у часе інтэрвію японскаму інфармацыйнаму агенцтву Кіёда Цусін.

У прыватнасьці, А.Лукашэнка зазначыў: «Японія валодае найвышэйшымі тэхналёгіямі ў сфэры атамнай энэргетыкі. Мы вельмі б хацелі супрацоўнічаць зь Японіяй, калі яна прапануе найлепшы праект па цане, якасьці і іншых крытэрах». Пры гэтым ён падкрэсьліў, што Беларусь адкрытая для супрацы ў гэтай сфэры з усімі дзяржавамі.

Лукашэнка нагадаў: цяпер у якасьці патэнцыйных удзельнікаў будаўніцтва АЭС выступаюць тры групы кампаніяў: амэрыкана-японская, францыска-нямецкая і расейская. Японія разглядаецца як дзяржава, здольная пабудаваць самы бясьпечны рэактар.

Варта нагадаць, што Расея настойліва прапануе ўласную кандыдатуру ў якасьці будаўніка. Акурат на гэтым акцэнтаваў увагу ў часе свайго першага візыту ў Беларусь прэм'ер-міністар Расеі Віктар Зубкоў. Ён запэўніў, што Расея здольная прапанаваць «найбольш рацыянальны варыянт будаўніцтва АЭС», прытым «з арганізацыяй бясьпекі на ўзроўні сусьветных стандартаў».



**Так выглядае японская АЭС.**

Пра магчымы ўдзел у праекце паведаміў і пасол Кітаю ў Беларусі У Хунбінь, але падрабязнасьці не раскрыў.

Паводле намесьніка міністра энэргетыкі Беларусі Міхаіла Міхадзюка, канчатковы выбар пляцоўкі для будаўніцтва АЭС будзе зроблены ў 2008 г. Цяпер вядуцца пошукі па дзьвюх пляцоўках у Магілёўскай вобласьці. На мінулым тыдні стала вядома, што да ацэнкі пляцовак будуць прыцягнутыя спэцыялісты Міжнароднага агенцтва па атмнай энэргіі (МАГАТЭ).

**Сямён Печанко**

## Станіслаў Шушкевіч: Японскі праект надзейны, але дарагі

Станіслаў Шушкевіч пракамэнтаваў заяву Аляксандра Лукашэнкі наконт магчымага ўдзелу японскіх спэцыялістаў у пабудове АЭС на тэрыторыі Беларусі.

Найхутчэй гэта палітычная заява. Мяркую, што такім чынам Лукашэнка адгукнуўся на ініцыятыву японскага ўраду ўтварыць так званую зону росквіту, у якую, паводле плянаў японцаў, павінна патрапіць і нашая краіна. Праграма дзеяньняў прадугледжвае разьвіцьцё эканомікі, бізнэсу і энэргетыкі, у тым ліку ў шэрагу краінаў. Адпаведны ліст разаслала японскае МЗС.

Што да прапановы А. Лукашэнкі, то яна выклікае супярэчлівыя пачуцьці. З аднаго боку, гэта вельмі добра, бо японскія АЭС сапраўды вельмі надзейныя, а ўдзел амэрыканскага боку можа вырашыць пытаньне сыравіны, якой Японія ня мае. З другога боку, гэта вельмі дарагі праект. Калі пры пераходзе на новыя кошты на расейскія энэрганосьбіты Беларусь сутыкнулася з праблемай пошуку дадатковых сродкаў у памеры $1,5 млрд, то у дадзеным выпадку гаворка вядзецца пра суму ў 5—6 разоў большую. Акрамя таго, як мне вядома, амэрыканцы не будуюць новых АЭС, асноўная праца ў гэтай сфэры вядзецца вакол падвышэньня эфэктыўнасьці выкарыстаньня ўжо створаных станцыяў.

**Запісаў СП**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Як па-Вашаму, хто павінен збудаваць Беларусі АЭС?**

| | |
|---|---|
| японцы з амэрыканцамі | 84 (24,6%) |
| французы зь немцамі | 111 (32,5%) |
| расейцы | 3 (0,9%) |
| АЭС Беларусі ня трэба | 144 (42,1%) |

Усяго прагаласавала: 342

## СЬЦІСЛА

### «FT»: Замежная палітыка Буша катастрафічная

Візыт прэзыдэнта Расеі Пуціна ў Іран можна разглядаць як поўную паразу палітыкі ЗША ў Іране. Як піша газэта The Financial Times, толькі катастрафічная замежная палітыка адміністрацыі прэзыдэнта ЗША Буша ў Іране дазволіла Расеі іграць ключавую ролю ў рэгіёне. Такім чынам, ЗША самі перадалі Іран ва ўладу расейскай палітыкі.

### Студэнты пратэстуюць супраць Чавэса

У сталіцы Вэнэсуэлы былі сутыкненьні паліцыі з студэнтамі, якія пратэставалі супраць зьменаў канстытуцыі, што касавалі б абмежаваньні па тэрмінах прэзыдэнцтва. Рэфэрэндум па Чавэсавай рэформе будзе ў сьнежні. Для прыкрасы ў адным пакеце з тэрмінамі — прапановы скараціць працоўны дзень і г.д.

### Пярэваратні ў пагонах

Як стала вядома інтэрнэт-выданьню «Белорусский партизан», на тым тыдні кіраўнік КДБ агучыў інфармацыю: за апошнія тры гады да крымінальнай адказнасьці прыцягнутыя 19 супрацоўнікаў ведамства.

Калі ўлічыць, што справы супраць працаўнікоў такой далікатнай сфэры ўзбуджаліся ў крайніх выпадках, стан законнасьці ў службах выклікае трывогу.

**МБ**

# Антысэмітызм ці ляпсус?

Рэпліка Лукашэнкі ледзь не прывяла да адкліканьня ізраільскага пасла.

Заявы Аляксандра Лукашэнкі падчас прэс-канфэрэнцыі для расейскіх журналістаў 12 кастрычніка ледзь не распалілі міжнароднага скандалу, які мог скончыцца адкліканьнем ізраільскага пасла зь Беларусі і які нанёс шкоду міжнароднай рэпутацыі Беларусі.

Нагадаем, Лукашэнка тады сказаў наступнае: «Калі вы былі ў Бабруйску, вы бачылі, у якім стане горад? Страшна было зайсьці, сьвінушнік быў. Гэта ў асноўным габрэйскі быў горад, вы ведаеце, як габрэі ставяцца да месца, дзе яны жывуць. Паглядзіце ў Ізраілі, я вось быў…».

Словы Лукашэнкі беларуская прэса прапусьціла міма вушэй, але яны практычна адразу знайшлі рэзка нэгатыўны водгук у кіраўніцтва Ізраілю. 18 кастрычніка міністарка замежных справаў гэтай краіны Цыпі Ліўні заявіла: «Сусьветныя лідэры павінны ўзяць на сябе адказнасьць за барацьбу супраць антысэмітызму, які паднімае выродлівую галаву ў розных частках сьвету, а не заахвочваць яго».

МЗС Ізраілю запатрабавала тлумачэньня такіх выказваньняў Лукашэнкі ад пасла Беларусі ў Ізраілі Аляксандра Ляшчэні. Падчас сустрэчы з намесьнікам кіраўніка дэпартамэнту Эўропы і Азіі ізраільскага МЗС Піні Авіві Ляшчэня паспрабаваў неяк абвергнуць словы кіраўніка Беларусі, чым выклікаў яшчэ большае абурэньне. «Гэта ня нейкі клерк — гэта ваш прэзыдэнт, ні менш ні больш, і мы шакаваныя і выказваем нашае абурэньне. Апрача прэзыдэнта Ірану ніхто так не гаворыць», — сказаў Піні Авіві пасьля сустрэчы зь Ляшчэнем.

Ізраільскі МЗС меркаваў адклікаць зь Беларусі пасла Зэева Бэн-Ар'е, але потым было прынятае рашэньне не рабіць гэтага. Сам спадар пасол, які цяпер у адпачынку, так пракамэнтаваў сытуацыю: «Заявы прэзыдэнта Беларусі пакідаюць зьдзіўленьне і шкадаваньне. У гэтых выказваньнях чуецца водгалас, як я спадзяваўся, даўно пахаванага гісторыяй асьвечанага чалавецтва міту аб габрэях неахайных, брудных, якія дрэнна пахнуць, міту антысэміцкага. Такое ўражаньне, што Бабруйск быў незалежнай габрэйскай вотчынай з сваім асобным бюджэтам, а не адным зь беларускіх гарадоў, дзе адказнасьць за добраўпарадкаваньне і сродкі для гэтага былі ў руках афіцыйных уладаў. Я хацеў бы, каб беларускія гарады дасягнулі ўзроўню муніцыпальных і ўвогуле сацыяльных службаў Ізраілю зь яго, скажам, мэдыцынскім абслугоўваньнем, клопатам аб састарэлых і інвалідах, барацьбой з наркотыкамі, алькагалізмам і гвалтам у сям'і, абсталяваньнем дзіцячых садкоў і школаў, хоць прэзыдэнт і ўгледзеў дзесьці непадстрыжаную траву».

Не засталіся выказваньні Лукашэнкі незаўважанымі і міжнароднай супольнасьцю. Старшыня ПАРЭ Рэнэ ван дэр Ліндэн выказаўся так: «Антысэміцкія заўвагі Лукашэнкі могуць быць на мяжы абсурду, але гэта ня можа быць прычынай, каб не лічыць іх непрымальнымі. Лукашэнку варта было б задумацца над гэтым і папрасіць прабачэньня за свае ганебныя словы, калі ён сур'ёзна жадае наблізіцца да Эўропы».

Асудзілі словы Лукашэнкі і ў амэрыканскім пасольстве ў Менску. У аўторак пасольства распаўсюдзіла адмысловую заяву, у якой гаворыцца, што «ўрад ЗША заклікае А.Лукашэнку адмовіцца ад гэтых выказваньняў».

Па сёньня ніхто зь дзяржаўных чыноўнікаў не выбачыўся перад Ізраілем за гэтыя заявы.

Ізраільская прэса пачала параўноўваць А. Лукашэнку з Махмудам Ахмадзінэжадам, добра вядомым сваім антысэмізмам. Праўда, адзначаюць, што «антысэмітызм Лукашэнкі хутчэй «побытавы», чым дзяржаўны».

**Зьміцер Панкавец**




**Побытавы антысэмітызм: апаганены мэмарыял «Яма» ў былым менскім гета.**

### Вандалізм у Бабруйску

На габрэйскіх могілках у Бабруйску вандалы апаганілі 15 магілаў. Зламысьнікі павалілі помнікі, а некаторыя з мармуровых плітаў разьбілі. Раней на браме гэтых жа могілкаў і на прыпынку побач зь ім была намаляваная свастыка і напісаныя зьнявагі на адрас габрэяў. Паводле папярэдніх падлікаў, шкода, нанесеная вандаламі, склала больш як $12 тысяч

### КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

Беларуская прэса, у тым ліку «Наша Ніва», старалася абысьці гэтыя словы А. Лукашэнкі маўчаньнем. Газэты не ўключылі іх у свае справаздачы пра тую прэс-канфэрэнцыю. Гэта было, паміж іншага, ад нежаданьня прыцягваць увагу да выказваньняў, якія могуць яшчэ болей сапсаваць і без таго кашмарны вобраз Беларусі і беларускага народу ў сьвеце.

Ізраіль не змаўчаў.

Слова — не верабей. Гэта адзін з найгоршых дыпляматычных праколаў нашага кіраўніцтва, які надоўга азмрочыць наш імідж, — не выпадковы пракол, а простае наступства палітычнае гульні, якая вядзецца на расейскім полі.

Што ж напіша пра гэта «Советская Белоруссия»? Ці нязьменны рэдактар Павал Якубовіч? І ці стане гэта хоць для кагосьці ў нашай дзяржаве нагодай для пераацэнкі каштоўнасьцяў? Хочацца верыць, што так.

Няма горш для Рэспублікі, калі яе дзеячы пачынаюць зарабляць палітычны капітал на прыніжэньні нацыянальных ці моўных групаў — як гэта ўжо было з палякамі (наркотыкі і лаянка Борыс), ці людзьмі, якія прынцыпова размаўляюць па-беларуску, якіх пэўныя чыноўнікі іначай як «сьвядомымі», з кпілівай інтанацыяй, не называюць.

Моташлівая брыда стала нормай.

Што да словаў, якія так балюча апяклі жыдоў, то гэта не былі словы беларускага народу. Беларускі народ свае словы пра габрэяў сказаў даўно — вуснамі Купалы, Бядулі, Барадуліна.

**Андрэй Дынько**

# Першая камандзіроўка

Пра Бабруйск і антысэмітаў піша **Віталь Тарас**.

На мінулым тыдні набыткам сусьветнай грамадзкасьці стала навіна: мадам Сэсыль Мары Сара Ізабэль Сіганэр-Альбэніс разводзіцца са сваім мужам Нікаля. Наўрад ці гэта стала б навіной, калі б прозьвішча яе мужа не было Сарказі, і ён ня быў прэзыдэнтам Францыі. А так паведамленьні пра ягоны развод (дарэчы, паводле францускіх законаў, кіраўнік дзяржавы непадсудны і таму ня можа разьвесьціся, пакуль займае сваю пасаду) на нейкі час адсунулі на другі плян многія іншыя рэчы. Напрыклад, паведамленьні з Турэччыны, якая рыхтуе ўварваньне ў іракскі Курдыстан.

Сам факт, што Сарказі стаў першым прэзыдэнтам Францыі, які афіцыйна разводзіцца са сваёй жонкай, заслугоўвае ўвагі, паколькі пэўным чынам сьведчыць пра сёньняшні стан грамадзкай думкі ў Францыі, а таксама ў Эўропе ў цэлым. Наўрад ці большай сэнсацыяй сталася б перамога на прэзыдэнцкіх выбарах галоўнай спаборніцы Сарказі Сэгален Руаяль, якая перабывала са сваім мужам — таксама вядомым палітыкам — у грамадзянскім шлюбе, пакуль не разышлася пасьля выбараў.

Муж і жонка Сарказі жанатыя ня першы раз, у абоіх ёсьць дзеці ад папярэдніх шлюбаў. Іх супольнаму сыну цяпер 10 гадоў. І хаця афіцыйна падставай для разводу мадам Сэсыль назвала сваю нелюбоў да публічнай палітыкі, у Францыі не было сакрэтам, што незадоўга да выбараў у яе быў раман, але потым яна вярнулася да мужа.

Зразумела, усё гэта стала вядома, дзякуючы бульварнай прэсе. (Сам тэрмін, дарэчы, узьнік у Францыі, калі танныя газэты пачалі прадаваць на вуліцах і бульварах.)

Але аб разводзе Сарказі пісалі й гаварылі самыя салідныя выданьні і міжнародныя тэлерадыёкампаніі. Праўда, як толькі мадам Сэсыль паведаміла пра развод з мужам, сусьветная прэса амаль страціла цікавасьць да яе. Яна і сам факт разводу перасталі быць фактарам міжнароднай палітыкі. Цяпер ужо ніхто ня будзе запытвацца аб тым, якую ролю, напрыклад, адыграла (і ці адыграла?) Сэсыль Сарказі ў вызваленьні баўгарскіх мэдсёстраў зь Лібіі.

А Сарказі як прэзыдэнту вялікай дзяржавы наканавана заставацца ў цэнтры ўвагі СМІ да сканчэньня прэзыдэнцкага тэрміну. Тут гаворка не пра цынізм прэсы (пра жоўтую прэсу ўвогуле няма размовы) і не пра норавы францускай палітычнай эліты — яны такія, якія ёсьць. А пра тое, што той, хто апынуўся на вяршыні ўлады, у дэмакратычнай дзяржаве ня можа разьлічваць на нейкія сакрэты, хай сабе й асабістага характару, ад грамадзкасьці. Яшчэ адносна нядаўна, калі прэзыдэнтам Францыі быў Франсуа Мітэран, пра ягоную каханку не прынята было пісаць у прэсе. Цяпер гэта выглядае анахранізмам.

Дарэчы, у Эўропе вельмі зьдзіўляліся, калі пры канцы 90-х успыхнуў скандал вакол прэзыдэнта ЗША Біла Клінтана і стажоркі ў апараце Белага дому Монікі Левінскі. Дзівіліся ня столькі паводзінам Клінтана, які дазволіў сабе «раман» у Белым доме, колькі таму факту, што прэзыдэнту гэта пагражала імпічмэнтам. Сёньня і ў ЗША мала хто ўзгадвае тую гісторыю. Калі пішуць пра Гілары Клінтан, якая рэальна прэтэндуе на тое, каб стаць першай жанчынай — прэзыдэнтам ЗША, дык ня ў сувязі з адультэрам яе мужа. Імя Біла Клінтана, безумоўна, ня можа ня згадвацца ў прэзыдэнцкай кампаніі, але журналістаў больш цікавіць не былое мужа і жонкі Клінтан, але дзень сёньняшні.

Напрыклад, ці ня будзе экс-прэзыдэнт у выпадку перамогі ягонай жонкі на выбарах уплываць на палітыку ЗША? Клінтан, дарэчы, ужо запэўніў у адным з інтэрвію, што ён «сыдзе на задні плян», то бок умешвацца ў кампэтэнцыю прэзыдэнта не зьбіраецца.

І Гілары Клінтан ёсьць уласныя перавагі — як і недахопы, дарэчы. Ніхто яе не ўспрымае як усяго толькі жонку былога прэзыдэнта. Аб ёй мяркуюць паводле яе дзейнасьці на пасадзе сэнатара і галоўнага прэтэндэнта на пасаду прэзыдэнта ЗША ад Дэмакратычнай партыі.

У палітычнай барацьбе няма папраўкі на пол. Адзін даволі вядомы амэрыканскі (расейскамоўны) журналіст сказаў нядаўна, што Гілары паводзіць сябе ў палітыцы як мужчына ў спадніцы й нават апошнім часам «ня голіць ногі». Гэтае няcмачнае, мякка кажучы, выказваньне пакінем на сумленьні журналіста. Але калі дапусьціць, што гэтыя словы сталі б вядомыя Гілары Клінтан, думаю, наўрад ці яна стала б судзіцца з журналістам ці ўвогуле неяк рэагаваць на зьняваГу.

Гэта — частка платы за папулярнасьць у палітыцы, за магчымасьць быць увесь час у цэнтры ўвагі прэсы, прысутнічаць на тэлеэкранах і першых палосах газэтаў, за сам намер стаць на чале дзяржавы, урэшце. Неабходнасьць увесь час трымаць справаздачу перад грамадзтвам, у тым ліку далёка ня лепшай ягонай часткай, змагацца за свой імідж, за




PHOTO.BYMEDIA.NET

падтрымку выбарцаў — гэта і ёсьць непасярэдная праява дэмакратыі. Падабаецца яна камусьці альбо не, усе вымушаныя гуляць паводле яе правілаў. І пры гэтым — каму больш дадзена (харызмы, грошай, таленту, удачы), з таго больш грамадзтва спытае.

## Пра клапоў і антысэмітаў

А цяпер да іншай тэмы. Насамрэч, менавіта зь яе меўся я пачаць гэтыя нататкі. І ўсё, што сказана вышэй — усяго толькі прадмова.

Але спачатку зраблю яшчэ адно адступленьне. Гадоў — дай Бог памяці — трыццаць таму мне давялося паехаць у першую ў сваім жыцьці журналісцкую камандзіроўку, ад газэты «Знамя юности». Я павінен быць удзячны за гэта тагачаснаму загадчыку аддзелу (не памятаю ўжо якога) пісьменьніку Кастусю Тарасаву. Кажу пра гэта без усялякай іроніі, бо менавіта дзякуючы Тарасаву пачаў асвойваць журналістыку на практыцы. Мне было дадзенае заданьне напісаць на тэму бытавога абслугоўваньня насельніцтва, так бы мовіць, на раёне. Падчас камандзіроўкі ў Бабруйск я даведаўся ўпершыню, што савецкі «ненавязьлівы сэрвіс» залежыць, напрыклад, ад таго, што ў атэльле бракуе нітак, а ў кацельню лазьнева-мыйнага камбінату не завезьлі вугалю.

Але я цяпер не аб тым. Тагачасны Бабруйск у мяне вялікага ўражаньня не пакінуў, але й не расчараваў. Звычайны савецкі раённы цэнтар. Звычайны савецкі гатэль, у якім ніколі няма вольных нумароў. Паколькі я прыехаў з цэнтральнай газэты, мне «выдзелілі», у парадку выключэньня, паўлюкс. Праўда, там ужо жыў адзін пастаялец, але затое і заплаціць трэ было ўдвая меней.

Выпадковы сусед, сталага веку лысаваты начальнік абласнога ўзроўню, доўга да мяне прыглядаўся, потым пачаў распытваць: хто я, адкуль, у якой газэце працую і г.д. Я адказваў неахвотна, як кажуць, зь ветлівасьці, спадзеючыся, што сусед ад мяне адстане. Але адчуваў, што нейкае галоўнае пытаньне, якое таму карцела задаць, ён трымае пра запас. І нарэшце яно прагучала: ты, часам, не яўрэй? Не жадаючы корпацца ў сваёй радаслоўнай ды яшчэ пры чужым чалавеку, я адказаў коратка: не! Але яўрэйская кроў у табе ё-о-осьць, — задумліва сказаў чалавек і, яўна задаволены сваёй здагадкай, пайшоў спаць. А раніцай пачаў мяне супакойваць: «Не, ты не падумай, сынок, я ж не антысэміт, я ж па-харошаму… Ну, прызнайся, ты ж яўрэй, так?»

Гэта было першым маім сутыкненьнем у жыцьці з так званым побытавым антысэмітызмам, нагэтульні ж звычайным і распаўсюджаным у савецкім жыцьці, як недахват нітак у атэльле ці засільле клапоў у нумары «паўлюкс». І гэта, як я цяпер добра разумею, быў яшчэ ня горшы з магчымых выпадкаў. Але ні тады, ні цяпер ніколі не ўступаю з падобнымі людзьмі ў дыскусію. Нейкім унутраным пачуцьцём заўсёды адчуваў: нічога ты гэтым людзям не давядзеш, дый ня трэба зь імі размаўляць. Хіба ж варта адказваць на сабачы брэх? Сказаць антысэміту, што ты яўрэй — значыць, узрадаваць яго тым, што ягоная «здагадка» пацьвердзілася. Сказаць, што не — значыць, узрадаваць яшчэ больш: «а, дык ты баішся прызнацца ў тым, што ніжэй за мяне!...»

Гідкае пачуцьцё ў прысутнасьці такіх людзей падобнае на тое, якое адчуваеш, калі выпадкова ўступіш у сабачае г… Быццам і ня страшна, назаўсёды не прыліпне, але ўсё адно брыдка. На вялікі жаль, большая частка грамадзтва такіх пачуцьцяў ня мае, не прышчэпленыя яны зь дзяцінства, як прышчапляюць воспу або халеру для ўстойлівасьці ад сьмяротнай хваробы. Наадварот, у нашым грамадзтве хапае індывідаў, якія адчуваюць нянавісьць і агіду ў адносінах да яўрэяў, армянаў, чачэнаў, пшэкаў, лабусаў, а таксама піндосаў і italьяшак, ды каго заўгодна яшчэ. І пачуваюцца яны ў грамадзтве вольна, не саромеюцца сваіх поглядаў, бо ніхто іх, прынамсі, услых, не асуджае.

## У Бабруйск!

І гэтак ня толькі ў Беларусі. Антысэміцкія настроі жывуць і ва Ўкраіне, і ў Польшчы, і ў Францыі (нягледзячы на тое, што прэзыдэнтам яе стаў Нікаля Сарказі, напалову вугорац і на чвэрць яўрэй). Нядаўняе апытаньне ў Нямеччыне паказала, што амаль чвэрць немцаў лічыць, што, як бы гэта мякка сказаць — ну, так: «ня ўсё толькі дрэннае было пры Гітлеры». Можна не сумнявацца, што сярод тых, хто ў гэтым перакананы, шмат і такіх, хто ня лічыць надта кепскім зьнішчэньне яўрэяў у газавых камэрах.

Але і ў Эўропе, і ў ЗША, і ва ўсім цывілізаваным сьвеце палітык, які займае высокую пасаду ў дзяржаве або толькі прэтэндуе на яе, ня можа дапусьціць антысэміцкіх выказваньняў. (Да гонару прэзыдэнта Пуціна трэба адзначыць, што хоць ён і вядомы сваімі выразамі кшталту «мачыць у сарціры», але даваць моўныя характарыстыкі іншым нацыянальнасьцям сабе не дазваляе.) Развод альбо нявернасьць можа дапусьціць. Расізм — не. Бо гэта будзе азначаць палітычную сьмерць альбо пераход у разрад «маргіналаў», кшталу Ле Пэна ці айца Рыдзыка.

Заходняя паліткарэктнасьць, на жаль, не замяняе маралі. Ад таго, што людзі ў офісах перастануць распавядаць жарты «пра бляндынак» і «пра яўрэяў», іхнае сапраўднае стаўленьне да жанчынаў і нацмяншыняў ня зьменіцца. Але прынамсі, наймаены на працу ў заходнюю карпарацыю чалавек цяпер ведае, што жыць у грамадзтве і быць вольным ад законаў гэтага грамадзтва ня можна. А калі абыватель чуе, што кіраўнік дзяржавы, у якой ён жыве, дазваляе сабе тое, што можа дазволіць сабе хіба п’яны чалавек на вуліцы, гэта, канечне, падымае абывателя ў ягоных вачох: «Глядзіце, ён такі самы, як я!» Адначасна гэта апускае кіраўніка і саму дзяржаву на вельмі нізкі ўзровень — прынамсі, у вачох цывілізаванай супольнасьці.

Дарэчы, сярод часткі расейскамоўнай інтэрнэт-супольнасьці ёсьць такі выраз: «в Бобруйск, жывотнае!» На слэнгу інтэрнэтчыкаў так пасылаюць тых, хто мае нізкі маральны і інтэлектуальны ўзровень ці пачынае хаміць у сеціве. Але сэнсавая нагрузка гэтага выразу не такая прымітыўная, як можа падацца. Прынамсі, ён не нясе антысэміцкага зьместу — хутчэй, наадварот. Тых, каго цікавіць сэнс і паходжаньне згаданых словаў, можа зайсьці на сайт babruisk.com, альбо на расейскую вікіпэдыю. Але не адмоўлю сабе тут у задавальненьні працытаваць апавяданьне Ўладзіміра Сарокіна «Дарожнае здарэньне».

«Ты ж расеец? Ты нарадзіўся ў Расеі? Ты хадзіў у сярэднюю школу? Ты служыў у войску? Ты вучыўся ў тэхнікуме? Ты працаваў на заводзе? Ты езьдзіў у Бабруйск? Езьдзіў у Бабруйск? У Бабруйск езьдзіў? Езьдзіў, га? Езьдзіў? Чаго маўчыш? У Бабруйск езьдзіў? Чаго косіш? Га? Заела, так? Езьдзіў у Бабруйск? Ты, …? У Бабруйск езьдзіў? Езьдзіў, падла? Езьдзіў, гад? Езьдзіў, падла? Езьдзіў, б..?»

Я — езьдзіў. Па сутнасьці, усе мы выйшлі з Бабруйска. Не з цудоўнага беларускага гораду на рацэ Бобр зь яго шматвяковай гісторыяй. А з таго месца, якое зрабілася сымбалем… не, не яўрэйскага жыцьця, а савецкай беспрасьветнай, сапраўды сьвінскай рэчаіснасьці.

Але ці выйшлі?

# Віктар Івашкевіч: «Я не займаюся інтрыгамі»

БНФ занурыўся ва ўнутрыпартыйную барацьбу зь пераходам на асобы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Віктар Івашкевіч назваў сябе «дырэктарам БНФ».**

У суботу прайшоў чарговы сойм Партыі БНФ. Нічым асаблівым ён не вылучаўся, апроч адной навіны — намесьнік старшыні партыі Віктар Івашкевіч агучыў свой намер балятавацца ў старшыні Партыі. Да гэтага меркавалася, што на зьезьдзе 8—9 сьнежня барацьбу за старшынскі фатэль павядуць сёньняшні кіраўнік БНФ Вінцук Вячорка і ягоны намесьнік Алесь Міхалевіч.

Адразу пасьля заяваў Віктара Івашкевіча ў інтэрнэце зьявілася мноства здагадак і меркаваньняў адносна гэтага вылучэньня. Частка выказвалася, што гэта нейкая хітрая шматхадоўка Вячоркі, іншыя гаварылі пра раскол у партыі.

Каб абвергнуць ці пацьвердзіць людзкія здагадкі, Віктар Івашкевіч у аўторак і склікаў прэс-канфэрэнцыю. Івашкевіч зьявіўся на ёй у кампаніі з прафэсарам Юр’ем Хадыкам і кіраўніком Віцебскай абласной арганізацыі ПБНФ Кастусём Смолікавым.

Івашкевіч расказаў, што пра намер балятавацца на старшынства ён заявіў Вячорку і Міхалевічу яшчэ ў чэрвені, але гэта не афішавалася. «Як аднаму з заснавальнікаў партыі, мне не абыякавы яе лёс. У партыі сёньня відавочныя крызісныя зьявы. Восем гадоў — гэта вельмі вялікі тэрмін для знаходжаньня на чале партыі, прыйшоў час нешта мяняць. Разам з тым, кандыдат на гэтую пасаду мусіць сябе нечым зарэкамэндаваць. Але, прабачце, у каго я не пытаўся, ніхто ня ведае, чым канкрэтна займаецца Міхалевіч, я таксама ня ведаю. Чым бліжэйшы зьезд, тым мацней абвастраецца барацьба між групоўкамі Міхалевіча і Вячоркі. Гэтыя хлопцы ўжо апусьціліся да ўзроўню пэрсанальных абразаў. Сёньня ўжо не для каго не зьяўляецца сакрэтам, што ў выпадку перамогі любога з кандыдатаў у партыі пачнуцца зачысткі, а гэтага нельга дапусьціць. Калі перамога акажацца за мной, то я гатовы прадставіць любую працу і Алесю, і Вінцуку. Галоўнае, каб у іх было жаданьне працаваць. За апошнія гады я стаў «Дырэктарам БНФ». Чалавекам, які браў на сябе розныя арганізатарскія функцыі. Зь якімі, лічу, няблага спраўляўся. Я стаў лідэрам Партыі БНФ, сёньня я маю шанец стаць яе старшынём», — адзначыў В.Івашкевіч.

Івашкевіч сказаў, што для яго сёньня асабліва балюча тое, што Партыя БНФ зь вядучай палітычнай сілы краіны ператварылася ў шараговага члена АДС. «Мая задача ператварыць БНФ у найбуйнейшую партыю краіны, лідэра дэмакратычных сілаў, які мог бы ўзначаліць шырокі грамадзкі рух за перамены ў краіне. Я ніколі не займаўся інтрыгамі, не займаюся і цяпер. Я вылучаюся на старшыні толькі з той мэтай, каб стаць старшынём, а ня зьняць сваю кандыдатуру на карысьць іншай. Я не займаюся дробнымі гешэфтамі», — адзначыў Івашкевіч.

Юры Хадыка прызнаўся, што паставіўся да гэтай ініцыятывы Віктара Івашкевіча зь вялікай сымпатыяй. «Віктар неаднаразова зарэкамэндоўваў сябе як выдатнага арганізатара. Нядаўні «Эўрапейскі марш» гэта толькі пацьвердзіў, упершыню за доўгі час супраць яго ўдзельнікаў не была ўжытая фізычная сіла. Івашкевіч дакладна не прывядзе партыі да расколу, ён разумее, што адзінства — гэта вялікая каштоўнасьць, якую нельга бурыць», — сказаў Ю.Хадыка.

Віктар Івашкевіч таксама заклікаў прэсу пачаць абмеркаваньне тэмы «Партыя БНФ: учора і сёньня». «Нам важна зразумець, чым была, ёсьць і будзе партыя для краіны і людзей», — лічыць Віктар Івашкевіч. Таксама ён заклікаў сваіх канкурэнтаў правесьці перад зьездам адкрытыя дэбаты ў прысутнасьці прэсы.

Іншыя кандыдаты на пасаду старшыні Партыі БНФ на прэс-канфэрэнцыю не прыйшлі, хаця Вінцук Вячорка ў той момант знаходзіўся ў будынку Ўправы.

**Зьміцер Панкавец**

# Беларусь зьдзейсьніць маштабныя інвэстыцыі ў дрэваапрацоўку

Указ №529 прэзыдэнта прадугледжвае пабудову новых заводаў і рэканструкцыю існых вытворчасьцяў. Гэта натуральны крок, улічваючы, што лес — адзін зь нешматлікіх прыродных рэсурсаў Беларусі, а краіна атрымала ў спадчыну ад Савецкага Саюзу ўбогі ўзровень дрэваапрацоўкі. Каго цікавіла эфэктыўнасьць у гэтай сфэры, калі за сьпінай гуло зялёнае мора тайгі.

Да таго ж, дрэваапрацоўка — гэта адна зь нешматлікіх галінаў, якія аплаціцца разьвіваць у малых гарадах, такіх як Масты ці Івацэвічы.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Згодна з праектам ураду, новыя вытворчасьці павінныя запрацаваць на базе ААТ «ФанДАК», ААТ «Мазырдрэў», ААТ «Барысаўдрэў», ААТ «Мастоўдрэў», «Гомельдрэў», ААТ «Віцебскдрэў» ды ААТ «Івацэвічдрэў». На ААТ «ФанДАК» заплянаванае будаўніцтва міні-ЦЭЦ. Акрамя гэтага дзейныя заводы чакае мадэрнізацыя, а мэблевую вытворчасьць на ААТ «Гомельдрэў» і ААТ «Магілёўдрэў» — рэканструкцыя.

Гаворка ідзе пра забесьпячэньне рацыянальнага і комплекснага выкарыстаньня драўніны, уключэньня ў перапрацоўку дробнатаварнай і нізкасортавай сыравіны і пілавіньня. Задача — выйсьці на вытворчасьць прадукцыі з больш высокай дададзенай вартасьцю.

Аб'ём вытворчасьці да 2015 г. мае вырасьці да $743,7 млн.

Акрамя таго, мяркуецца замяніць шэраг імпартных тавараў (перадусім, ДСП, МДФ) беларускімі.

**Сямён Печанко**

## Цана на газ складзе каля 125 даляраў плюс-мінус 10

Цана на расейскі газ для Беларусі ў 2008 годзе складзе прыблізна 125 даляраў за тысячу кубамэтраў. Пра гэта заявіў журналістам 19 кастрычніка намесьнік міністра прамысловасьці і энэргетыкі Расіі Іван Мацэраў, які прыбыў у Менск у складзе дэлегацыі прэм'ера Зубкова. «У адпаведнасьці з формулай разьліку цаны, прадугледжанай у кантракце, цана газу для Беларусі будзе складаць 125 даляраў прыблізна. Роскід можа скласьці плюс-мінус 10 даляраў».

Што цікава, Расея адмаўляецца абмяркоўваць цану нафты і газу для Беларусі на перамовах. «Калі 31 сьнежня 2006 году быў падпісаны кантракт аб пастаўцы газу ў Беларусь, пытаньні паліўна-энэргетычнага комплексу вырашаныя ў аўтаматычным рэжыме, — сказаў І.Мацэраў. — Існуюць таксама дамоўленасьці аб пастаўках нафты ў Беларусь. Вывазныя мыты і спосаб іх разьдзелу таксама вызначаныя».

**СП**

## СЬЦІСЛА

### Купляем нафту ў Калініградзе

З кастрычніка Мазырскі НПЗ упершыню пачаў купляць нафту ў Калінінградзкай вобласьці РФ. Гэта выклікана зьніжэньнем аб'ёму паставак расейскай нафты па трубаправодзе. З Калінінграду сыравіна пастаўляецца чыгункаю. Да канца году Мазырскі НПЗ будзе набываць у кампаніі «Лукойл-Калінінград» па 50 тыс. т нафты штомесяц. Ад студзеня аб'ём паставак нафты па трубаправодзе скараціўся ў параўнаньні зь мінулагоднім ўзроўнем на 12,7% і склаў 11,269 млн т. У той жа час аб'ём перавозак сыравіны чыгункаю вырас на 4,3% — 1,603 млн т.

### Індыя таксама набіваецца ў саюзьнікі Ірану

Урад Індыі ўсё больш упэўнена гаворыць пра будаўніцтва нафта- і газаправоду, якія злучаюць Індыю і Іран, што можа раззлаваць ЗША. Як піша газэта The Financial Times, міністар фінансаў Індыі заявіў пасьля сустрэчы са сваім іранскім калегам у Вашынгтоне, што будаўніцтва газаправоду «цалкам выканальнае» і што «мы павінныя гэта зрабіць: у Ірана ёсьць газ, а нам патрэбны газ». Прадстаўнікі Вашынгтона зьбітыя з панталыку такім паваротам падзеяў і спадзяюцца, што Індыя спыніць перамовы з Іранам.

### Малако падаражэе

Міністэрства эканомікі ўлічыла прапанову Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчу аб падвышэньні закупных цэнаў у сувязі з падвышэньнем кошту сыравіны. Адпускныя цэны на малако, кефір, тварог і сьмятану ў кастрычніку і лістападзе вырастуць на 3%, у сьнежні — на 2%. Адначасова ўрад падвысіў закупныя цэны на малако на 10% у сувязі з ростам цэнаў на сусьветным рынку. І гэта не канец: Мінсельгасхарч просіць узьняць закупныя цэны на малако яшчэ на 25%, а на мяса — на 10%.

**СП; паводле БелТА, Bsb.by**

## ТЫМ ЧАСАМ

### Гуцэрыеў просіць прытулку ў Брытаніі

Расейскі міліярдэр Міхаіл Гуцэрыеў просіць палітычнага прытулку ў Вялікабрытаніі. Алігарх-уцякач падаў прашэньне 8 дзён таму.

Упершыню інфармацыя пра ўцёкі апальнага алігарха з Азэрбайджану ў Лёндан паступіла з крыніцаў, блізкіх да «справы Гуцэрыева», яшчэ тыдзень таму.

Гуцэрыеў меў удзел у Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе і цешыўся асаблівымі сувязямі з А.Лукашэнкам.

**МБ**

# Яны на практыку ўзяты цягаць цяжкія камяні



Дзяўчаты, якія выконваюць рабскую працу ў цэнтры сталіцы, цягаюць плітку для ходнікаў — навучэнкі Менскага будаўнічага каледжу №53 (былое ПТВ). Яны атрымліваюць спэцыяльнасьць «маляр, тынкоўшчык, абліцоўшчык».

Цяпер яны на практыцы, дапамагаюць будаваць ходнікі ў якасьці падсобных работніц — выконваюць цяжкую фізычную працу. Паводле іхных словаў, на практыку па спэцыяльнасьці нідзе не бяруць, бо няма месцаў. Таму каледж разьмеркаваў «на плітку», нават не пытаючы, ці згодныя яны так працаваць.

Як паведаміў намесьнік дырэктара па навучальна-вытворчай працы Віктар Печань, навучэнцы каледжу праходзяць практыку «толькі ў рамках сваёй прафэсіі». Практыка праходзіць на будаўнічых аб’ектах, вытворчых прадпрыемствах, заводах і фабрыках. Паміж каледжам і прадпрыемствам заключаецца кантракт, практыканты атрымліваюць заробак, пры гэтым набываючы кваліфікацыю. Калі становіцца вядомым, што прадпрыемства накіроўвае навучэнцаў на працу не па прафэсіі, то каледж разрывае ўсе кантакты з гэтай арганізацыяй.

Паводле словаў Віктара Печаня, такія выпадкі недапушчальныя, бо «нашая мэта — навучыць, а не зарабіць грошы». Што дачыцца дзяўчат-маляроў, якія носяць плітку, то «для іх існуе сьпіс прац, узгодненых з арганізацыяй, у тым ліку падрыхтоўка падмуркаў і сьцяжка».

Аднак навучэнцы каледжу кажуць іншае. Паводле іх, звычайнай практыкай стала разьмеркаваньне першакурсьнікаў на некваліфікаваную, а часам і брудную працу. Даводзіцца насіць плітку і зьбіраць сьмецьце, але інтарэсы навучэнцаў нікога не цікавяць. Камусьці загадваюць цягаць цэглу, а камусьці рабіць кладку, пры гэтым розьніца ў аплаце невялікая. «На плітцы» можна добра зарабіць, таму многія пагаджаюцца на час забыць пра спэцыяльнасьць.

Студэнты скардзяцца, што пыл набіваецца ў лёгкія, калі сухарэзам-баўгаркай пілуюць бардзюры, а маскі не заўсёды выдаюць. «А майстрам на гэта пляваць, яны пра гэта і размаўляць ня хочуць. Ім галоўнае, каб мы перад прыездам камісіі ўсё сьмецьце папрыбіралі».

**Яраслаў Сьцешык, фота аўтара**



### Галоўны ідэоляг Мядзельшчыны

Галоўны ідэоляг Мядзельшчыны **Надзея Гарновіч** забараніла дзіцячаму прытулку браць падарункі ад Партыі БНФ на той падставе, што «там і так усё добра!».

## 16 кастрычніка

### Клімава везьлі ў Мазыр тры дні

Палітвязьня **Андрэя Клімава** цягам трох дзён перавозілі зь Менску ў Мазырскую калёнію строгага рэжыму. Чыгункай зь Менску да Мазыра 328 км. Звычайны цягнік гэтую адлегласьць пераадольвае за сем гадзінаў.

### Жарскі зьлітаваўся над Падрэзам

Кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага тэхналягічнага ўнівэрсытэту паведаміла студэнту Зьмітру Падрэзу пра адлічэньне за «парушэньне статуту». Фактычна прычынай адлічэньня стаў «сыгнал» ва ўнівэрсытэт з боку мядзельскай міліцыі. З.Падрэз 6 кастрычніка быў затрыманы ў Мядзеле з налепкамі «Эўрапейскага маршу», на яго склалі пратакол. Канчатковае рашэньне наконт Зьмітра прымаў сам рэктар БДТУ Іван Жарскі: ён не пагадзіўся зь меркаваньнем кіраўніцтва факультэту наконт выключэньня юнака.

### Істомін галадаў у турме

Старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі АГП **Юры Істомін** цягам тыдня трымаў галадоўку ў спэцпрыёмніку Кастрычніцкага РУУС Горадні, пратэстуючы супраць незаконнага арышту. Ён быў арыштаваны напярэдадні «Эўрапейскага маршу» і асуджаны на 7 сутак за «нецэнзурную лаянку». Перад тым Ю. Істомін знаходзіўся за кратамі 5 сутак і таксама не прымаў ежу.

### Малітва салідарнасьці ля Сьвятога Язэпа

Блізу 50 маладзёнаў а 20-й сабраліся каля царквы на супольную малітву. Людзі трымалі партрэты палітзьняволеных і арыштаваных у сувязі з «Эўрапейскім маршам». Над усімі ўзвышаўся вялізны партрэт Зьмітра Дашкевіча. Акцыя скончылася супольным сьпяваньнем нацыянальнага гімну «Магутны Божа».

## 17 кастрычніка

### «Гомельская праўда» прызналася ў хлусьні

У судзе Чыгуначнага раёну Гомелю прадстаўніца афіцыйнай газэты «Гомельская праўда» **Алена Аленчанка** пагадзілася без судовага разьбіральніцтва надрукаваць абвяржэньне сваёй публікацыі. З пазовам выступіў грамадзкі актывіст, сябар АГП **Леанід Судаленка**. У артыкуле «Сваіх дзяцей — за мяжу, чужых — «у барацьбіты за дэмакратыю» (надрукаваны сёлета 2 жніўня), аўтар С.Грушэнка прыпісаў яму амаральныя і злачынныя дзеяньні. Нібыта сябры закрытага ўладамі грамадзкага аб'яднаньня «Грамадзянскія ініцыятывы», сябрам якога быў і Судаленка, заклікалі моладзь удзельнічаць у антыграмадзкіх мерапрыемствах. Паводле «ГП», сын актывіста паехаў на вучобу ў Польшчу па праграме для апазыцыйных актывістаў, хоць у дзейнасьці апазыцыі ўдзелу ня браў. Сп. Судаленка не атрымаў адказу на зварот у рэдакцыю газэты з патрабаваньнем абвергнуць несапраўдныя зьвесткі і таму зьвярнуўся ў суд.

### Ад Цянюты не адступаюцца

Моладзевага актывіста **Андрэя Цянюту** выклікалі ва ўпраўленьне КДБ па Гомельскай вобласьці, дзе дапыталі ў якасьці падазраванага у крымінальнай справе ў адносінах да незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт». Сьледчы ўзяў з хлопца расьпіску аб неразгалошваньні зьвестак, датычных дэталяў сьледзтва. Нагадаем, на працягу двух месяцаў актывіст восем разоў пад рознымі нагодамі затрымліваўся супрацоўнікамі міліцыі.

### Юхневіча схапілі другі раз

Па адбыцьці 7-дзённага арышту на Акрэсьціна дэмакратычнага актывіста **Паўла Юхневіча** адвезьлі ў суд Савецкага раёну Менску. За прысутнасьць на спэктаклі «Свабоднага тэатру» супраць яго быў складзены пратакол нібыта за «нецэнзурную лаянку». Судзьдзя **Людміла Савасьцян** пакарала Юхневіча арыштам на 15 сутак.

## 19 кастрычніка

### З Акрэсьціна ў ваенкамат

На Акрэсьціна моладзевага лідэра **Мікіту Сасіма** наведалі прадстаўнікі баранавіцкага ваенкамату і супрацоўнікі КДБ. Прадстаўнік ваенкамату папярэдзіў М. Сасіма аб адказнасьці за парушэньне правілаў вайсковага ўліку. Хлопцу загадалі прайсьці мэдкамісію і ўручылі позву ў ваенкамат пад росьпіс. Усё гэта здымалася на відэакамэру. Пасьля агляду баранавіцкія лекары паведамілі Сасіму пра неабходнасьць дадатковага абсьледаваньня ў мясцовай паліклініцы — дагэтуль адчуваюцца наступствы чэрапна-мазгавой траўмы, нанесенай яму амонаўцамі.

### Грамадзкасьць адстаяла Алену Макарэвіч

Пад ціскам грамадзкасьці кіраўніцтва 199-й сталічнай школы адмовілася ад ранейшага намеру выключыць вучаніцу 11 клясы **Алену Макарэвіч**, актывістку незарэгістраванага «Маладога фронту». Падставай быў яе ўдзел у «Эўрапейскім маршы». На сумоўі ў кабінэце дырэктара прысутнічалі бацькі Алены, супрацоўнікі КДБ і прадстаўнікі Міндукацыі. Пасьля нарады дырэктар школы **Васіль Грыб** паведаміў, што цяпер намеру выключаць дзяўчыну з навучальнай установы ня мае.

**На фота ўнізе:** Алена Макарэвіч падчас незалежнага рок-канцэрту.

### Жалезьнічэнка змагаецца за праўду

Гомельскі абласны суд адхіліў скаргу актывіста **Зьмітра Жалезьнічэнкі** на ягоны арышт і штраф. З.Жалезнічэнку абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкім месцы і непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі. Міліцыянты, седзячы ў аўто, «пачулі лаянку» Зьмітра, калі той быў у падземным пераходзе. Нагадаем, 7 верасьня Жалезьнічэнка быў адлічаны з 3 курсу Гомельскага ўнівэрсытэту за «сыстэматычнае парушэньне правілаў унутранага распарадку». 19 кастрычніка Міндукацыі прызнала законным ягонае адлічэньне.

**СП**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Вайцюшкевіч сьпяваў пра Штанге і Скарыну Піцерскага

19 кастрычніка ў канцэртнай залі «Менск» пры аншлягу прайшоў канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча і «WZ-Orkiestra».

Канцэрты Вайцюшкевіча традыцыйна зьбіраюць багата народу. Ня стаў выключэньнем і гэты. Сярод гледачоў былі Ўладзімер Арлоў, Валянціна Аксак, Стэфан Эрыксан, госьці зь Нямеччыны і Кітаю.

Пачаўся канцэрт з абвестак. Зьміцер Вайцюшкевіч паведаміў пра наступны канцэрт «WZ-Orkiestra», які адбудзецца 6 лістапада ў «Графіці». А потым, недзе ў лістападзе—сьнежні, на адной са сцэнаў Менску наладзяць яшчэ адзін выступ: «Хачу вас папярэдзіць, што гучаць мы будзем трошкі ня так, як цяпер, — новая праграма «Лірыка» на словы Генадзя Бураўкіна будзе рокавая». Пазьней паміж куплетамі ён неаднойчы нагадваў: «Мы — рокеры!»

## Самі з вусамі

Першай у праграме прагучала «Песенька галоднага Воўка» з «Цацачнай крамы». «Апошні куплет цяпер ужо неактуальны» — спыніўся раптам Вайцюшкевіч і патлумачыў: «Наша краіна жыве ўсё лепш, і ня трэба нам ніякай дапамогі, самі з вусамі, а таму — шліце ежу за акіян». Калі хто ня ведае, у арыгінале галодны воўк прасіў наадварот — каб ежу высылалі яму з-за акіяну. Потым сьпявак ня раз спыняўся, каб пракамэнтаваць тую ці іншую песьню. Паводле ягоных словаў, на адным з паўпадпольных канцэртаў у часе чарговай выбарчай кампаніі недзе ў глыбінцы бабуля ў першым шэрагу, паслухаўшы «Песеньку пра задаволенага Пеўня», зазначыла, што й ня ведала, якая ж прыгожая і мілагучная родная мова. Сьпяваючы пра бесклапотнага пеўня-гуляку, Зьміцер прыгадаў былога міністра культуры.

## Кумір дачнікаў

«Сёньня будзе багата песень пра дождж», — заўважыў лідэр «WZ-Orkiestra» і распавёў пра сваю даўнюю мару — пачуць свае песьні на 1-м канале радыё. Мара зьдзейсьнілася дзякуючы песьням пра дождж: у самую суш на радыё прагучала адна з такіх кампазыцыяў і адразу палюбілася ўсім, хто з надзеяй глядзеў на неба, чакаючы ад таго дажджу. Заля сустрэла гэтыя словы дружным сьмехам і, сьпяваючы разам «У чаканьні дажджу», засьведчыла, што не адны дачнікі любяць тыя песьні. Камэрнасьць малой залі, відавочна, спрыяла зваротнай сувязі паміж сцэнай і гледачамі. Сьпявак жыва рэагаваў на рэплікі з залі, без націску запрашаў сьпяваць разам зь ім, а часам і замест яго.

## Штанге і пецярбуржац Скарына

У той вечар прагучалі песьні ня толькі па-беларуску, але й па-расейску — кампазыцыі з альбому на вершы Ўладзімера Маякоўскага, а таксама песенька па-польску. Усе яны цёпла віталіся публікай. На сцэну ўвесь час ішлі цыдулкі з просьбамі выканаць улюбёную песьню. Зь вялікім адрывам перамагала «Іду да цябе», але яна так і не прагучала. «Ня гэтым разам», — папрасіў Зьміцер і скарыўся перад заляй, засьпяваўшы песьню на словы Андрэя Хадановіча «Мірныя людзі». Не адну ўсьмешку выклікала імправізацыя Вайцюшкевіча, калі сьпяваючы пра мару «перамагчы хоць раз на мундыялі», ён выгукнуў «Штанге!» — прозьвішча цяперашняга трэнэра нацыянальнай футбольнай зборнай.

Выконваючы на біс «Я нарадзіўся тут» разам з гледачамі, якія як адзін узьняліся з крэслаў, Зьміцер і тут не ўтрымаўся, каб засьведчыць абазнанасьць у найноўшых гістарычных сэнсацыях: «Я нарадзіўся тут, на пяць стагодзьдзяў пасьля пецярбуржца Скарыны».

Цягам канцэрту прагучалі песьні ці ня з кожнага альбому гурту — ад «Паравінаў году» да «Калыханак», таму можна сьмела сказаць — усе засталіся задаволеныя вечарынаю.

**Сямён Печанко**


GENERATION.BY

# Барысаўскі фэномэн

Барысаўскі БАТЭ за тры туры да фінішу датэрмінова стаў чэмпіёнам краіны па футболе. Чацьвёрты раз.

У гэтую нядзелю барысаўскі БАТЭ ў чацьверты раз у сваёй гісторыі стаў чэмпіёнам краіны па футболе (1999, 2002, 2006, 2007). Прычым, зрабілі яны гэта другі раз запар. Такое ў нашым першынстве не ўдавалася ніводнай камандзе ўжо больш за дзесяць гадоў.

Сымбалічна, што чарговы чэмпіёнскі тытул барысаўцы аформілі ў матчы зь менскім МТЗ-РІПА (0:0), які ўзначальвае былы трэнэр БАТЭ Юры Пунтус. Тры гады таму, калі Пунтус сыходзіў з БАТЭ, то шмат хто са спэцыялістаў меркаваў, што на гэтым могуць скончыцца залатыя дзянькі барысаўскага футболу. Першы сэзон пад кіраўніцтвам новага настаўніка Ігара Крывушэнкі толькі пацьвердзіў такія сумныя высновы. Каманда, якая дагэтуль ніколі не заставалася ў нацыянальным першынстве без мэдалёў, фінішавала толькі пятай.

Пачатак мінулага сэзону таксама не надаваў фанам БАТЭ аптымізму. Паводле папярэдніх прагнозаў барысаўцы не павінныя былі нават зачапіцца за мэдалі. Выйшла ж зусім інакш. Пасьля цяжкага старту БАТЭ выдаў бліскучую пераможную сэрыю. Не абышлося і без шанцаваньня, у апошнім туры менскае «Дынама» не змагло перагуляць аднаклюбнікаў зь Берасьця, тым самым пазбавіўшы неабходнасьці ў правядзеньні залатога матчу, але ж шанцуе мацнейшым.

Сёлетні сэзон прайшоў пры вялізнай перавазе БАТЭ над супернікамі. У чэмпіёнстве Крывушэнкі і кампаніі амаль ніхто не сумняваўся ўжо пасьля першага кругу. Пакуль БАТЭ атрымліваў адну перамогу за другой, канкурэнтаў кідала ў розныя бакі. Нестабільнасьць МТЗ-РІПА, «Гомелю», «Шахцёра» і дазволілі БАТЭ ўвесь чэмпіянат адчуваць сябе досыць камфортна, а першае месца заняць за чатыры гульні да фінішу.

Гэтая перамога барысаўскай каманды дазваляе гаварыць менавіта пра фэномэн БАТЭ, а ня трэнэра Пунтуса, у якога пасьля сыходу нічога не атрымліваецца.

Найперш посьпехі барысаўцаў грунтуюцца на добрай працы з моладзьдзю, а таксама на імпэтным генэральным дырэктары Анатолю Капскім, які не шкадуе ні ўласнага часу, ні здароўя на ўлюбёную каманду. Барысаўцы заўсёды рабілі і робяць стаўку на мясцовых футбалістаў, якіх вядуць у галоўную каманду з самых раньніх гадоў. Скажам, яшчэ летась ніхто толкам ня ведаў абаронцу Ягора Філіпенку, а сёньня ён гулец асновы зборнай Беларусі. Лідэрскія функцыі сёлета таксама адчулі зусім яшчэ маладыя Крывец, браты Дзьмітры і Павал Платонавы, Радзькоў, Стасевіч. Гульню каманды цэмэнтуюць некалькі дасьведчаных футбалістаў — Федаровіч, Блізьнюк, Ермаковіч, Ліхтаровіч. Ня лішнімі ў ансамблі клюбу таксама выглядаюць і легіянэры з Расеі — Казанцаў, Сахараў, Хагуш. Апошняга ўвогуле пачалі выклікаць на гульні моладзевай зборнай Расеі. У сваю чаргу Штанге выклікае ў зборную нашай краіны Радзькова, Філіпенку, Блізьнюка, Радзівонава, Стасевіча.

Гэты год стаў адметным для БАТЭ таксама выдатным выступам у эўракубках. Барысаўцы былі літаральна ў адным кроку ад трапляньня ў групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. Толькі недахопам досьведу можна патлумачыць нерэалізаваныя моманты ў бухарэсцкім матчы са «Сьцяўа». Пасьля БАТЭ прывёз у Беларусь каманду з элітнага гішпанскага дывізіёну «Вільярэал». Згуляць зь ім на роўных не ўдалося, але сам факт суперніцтва з такой камандай гаворыць сам за сябе.

Абсалютна дакладна, што пасьля такога ўдалага сэзону, большасьць футбалістаў каманды атрымаюць запрашэньні з добрых эўрапейскіх і расейскіх клюбаў. Разам з тым, практычна ніхто не сумняецца, што і налета БАТЭ будзе сярод галоўных прэтэндэнтаў на золата нацыянальнага першынства.

**Зьміцер Панкавец**



З-пад саветаў Беларусь выйшла выключна цэнтралізаванай. Цяпер гарады як Барысаў змацоўваюцца на спартовай (і палітычнай, і культурнай) мапе краіны.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



Алекс-Ільля (злева) і Эрык Гальперыны з здымкам свайго бацькі на родным падворку.

СЯРГЕЙ ГРЫЦ

## Алекс Курзэм наведаў Беларусь

22 кастрычніка Алекс Курзэм на чатыры дні прыехаў у Беларусь. Яго ўспаміны пра даваеннае жыццё ўрыўкавыя: малому ішоў пяты год. Здымкі сям'і, родны дом ён пабачыў толькі сустрэўшыся з зводным братам Эрыкам (іх бацька, Саламон Гальперын, які цудам выжыў пасьля расстрэлу, па вайне займеў іншую сям'ю). Сп. Курзэм пакланіўся месцу, дзе ў кастрычніку 1941 г. было расстраляна 1600 габрэяў, у тым ліку яго маці, брат і сястра. Таксама наведаў Яму, што ў колішнім менскім гета, Траецкае прадмесьце, Габрэйскі музэй. У чацьвер па абедзе ён адляцеў у Аўстралію.

**НХ**

# Сын эсэсаўскага палка

Габрэйскі хлопчык зь Беларусі «быў самым маладым нацыстам Рэйху»

Алекс Курзэм прыехаў у Аўстралію ў 1949 г. з маленькай карычневай валізкай і цяжкім багажом успамінаў.

Толькі ў 1997 г. вырашыў раскрыць сваю таямніцу. Ён распавёў сваёй сям'і ў Мэльбурне, што падчас другой сусьветнай вайны, ва ўзросьце пяці гадоў, стаў «сынам палка» ў войсках СС.

Гісторыя яго жыцьця была нядаўна апублікавана ў кнізе «Талісман».

«Яны далі мне форму, маленькую стрэльбу і маленькі пісталет», — распавёў Алекс Курзэм. — Мне давалі невялікія даручэньні — пачысьціць боты, прынесьці вады, разьвесьці вогнішча. Але мая асноўная праца была ў тым, каб забаўляць жаўнераў, аблегчыць іх існаваньне.



## Цяжкія ўспаміны

У выпусках кінахронікі яго называлі «самым малодым нацыстам Рэйху». Эсэсаўцы так і не даведаліся самую важную дэталь з жыцьця свайго «сына палка»: «Я быў габрэйскім хлопчыкам, які зьбег ад батальёну сьмерці».

20 кастрычніка 1941 г. нямецкая армія ўвайшла ў Койданава. «Я памятаю, як нямецкія жаўнеры пашыхтавалі ўсіх мужчынаў на плошчы і расстралялі іх, — згадвае Алекс. — Матуля сказала мне, што тату забілі, і нас усіх заб'юць. Я ўначы зьбег. Пацалаваў маму на разьвітаньне і схаваўся на ўзгорку ля вёскі». Удзень усю сям'ю зьнішчылі — маці, брата і сястру.

«Памятаю кусаў руку, каб ня плакаць наўзрыд. Я баяўся, што мяне знойдуць. Калі страляніна спынілася, ня ведаў, куды ісьці. Я застаўся зусім адзін. Мне было тады пяць ці шэсьць гадоў.

Я грукаўся ў хаты, і людзі давалі мне лусту хлеба, але казалі, каб я сыходзіў».

Алекс не замерз дзякуючы адзежы, якую здымаў з забітых жаўнераў.

У лесе ён пражыў дзевяць месяцаў, а потым адзін зь мясцовых жыхароў здаў яго латыскай паліцэйскай брыгадзе, што пазьней стала часткай СС. Паліцаі зладзілі масавую экзэкуцыю, і Алекс думаў, што заб'юць і яго.

«Побач стаяў салдат, і я папрасіў яго: «Пакуль вы мяне не забілі, ці можна мне зьесьці кавалачак хлеба?». Ён паглядзеў на мяне, а потым адвёў за будынак школы. Агледзеў і зразумеў, што я габрэй. «Кепска, кепска, — сказаў ён. — Слухай, я не хачу цябе забіваць. Я вазьму цябе з сабой, дам табе новае імя, а другім жаўнерам скажу, што ты — рускі сірата».

## «Сын палка»

Алекс Курзэм ня можа зразумець, чаму латыскі сяржант Екабс Куліс пашкадаваў яго. Арыйская зьнешнасьць дапамагла захаваць у сакрэце яго сапраўднае паходжаньне.

Маленькі Алекс пабываў на Ўсходнім фронце. Ён раздаваў шакалядкі каля цягнікоў, каб завабіць габрэяў у вагоны, якімі іх звозілі ў канцлягеры.

У 1944 г., калі стала ясна, што немцы прайграюць вайну, камандзір часткі адправіў яго жыць у латыскую сям'ю.

Празь пяць гадоў Алекс разам з той сям'ёй апынуўся ў Аўстраліі. Працаваў у цырку, потым стаў рамантаваць тэлевізары ў Мэльбурне. Ён нікому не расказваў пра мінулае.

«Зьяжджаючы з Эўропы, я сказаў сабе: «Забудзь пра мінулае. Ты пачынаеш новае жыцьцё. Я ўсім казаў, што мае бацькі загінулі ў часе вайны, але ў дэталі не ўлазіў».

Толькі ў 1997 г. Алекс распавёў пра ўсё родным. Разам з сынам Маркам ён наведаў Койданава, і высьветліў, што яго на самай справе называюць Ільля Гальперын. А ў латыскіх кінаархівах яны знайшлі кадры з маленькім Алексам у эсэсаўскай форме.

**Руская служба Бі-Бі-Сі**

# Дзякуй

**Зьмітру М., Вячаславу Б.** з Горадні.
**Г.Б.** з Чачэрскага раёну.
**С.В.** зь Бягомльскага раёну.
**М.А.** з Гарадоцкага раёну.
**І.І.** з Смалявіцкага раёну.
**Т.П., Андрэю Л., М.В., В.А., Анатолю І., А.С.** зь Менску.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.


з ь б я р ы «Кнігарню «Наша Ніва»




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна.**




**Вясна народу:**
Эсэістыка 1991—2007


ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Старшыня ТБМ адказвае дырэктару Першага каналу Беларускага радыё

**Паважаны Пётр Фёдаравіч!**

Ваш ліст я атрымаў і ўважліва прачытаў 12 сакавіка. Прачытаў і Ваш сказ пра «дзьвюхмоўе» як вынік плебісцыту і міжвольна ўсьміхнуўся. Цікавая рэч — наша з Вамі жыцьцё, і вельмі цікавыя бываюць у ім супадзеньні. Менавіта 12 сакавіка 12 год таму я, дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі, рашуча выступіў супраць згаданага Вамі «дзьвюхмоўя», добра разумеючы яго наступствы для нашай мовы і культуры. Таму і далучыўся да галадоўкі пратэсту ў залі парлямэнту. І дэпутаты рознага веку і палітычных поглядаў, гледзячы ў вочы пратэстуючых і кіруючыся сваім сумленьнем, не прагаласавалі за правядзеньне рэфэрэндуму, які мог зьнішчыць іх родную мову. Потым, ноччу 13 красавіка, нас зьбілі і выдалілі з будынку парлямэнту бандыты ў чорных масках. І толькі тады адбыўся не плебісцыт, як Вы пішаце, а рэфэрэндум з пэўнымі вынікамі і наступствамі. Аднак у гісторыі XX ст. быў вядомы эўрапейскі палітык, які вельмі любіў праводзіць менавіта плебісцыты. Чым гэта скончылася для яго асабіста, а таксама для яго краіны і народу, усім добра вядома. Іншая справа, што наша мова жыла тысячу гадоў да рэфэрэндуму, пражыве і тысячу гадоў пасьля яго.

Хачу таксама ўдакладніць, што я, у адрозьненьне ад Янкі Саламевіча, гэты факт нашай гісторыі «глупствам» не лічу, бо рыхтавалі адмысловую пастку для нашай мовы людзі разумныя і вельмі дасьведчаныя. Аднак у 1999 г., у час перапісу наш народ перакрэсьліў гэтыя задумы і назваў у большасьці сваёй роднай мовай менавіта беларускую. Падабаецца гэта каму ці не, але, як вы дакладна пішаце, «факт ёсьць факт».

Прашу Вас дапамагчы ТБМ у змаганьні за рэальнае, а не папяровае дзьвюхмоўе. Мы пастаянна атрымліваем скаргі грамадзян на тое, што ў гандлёвым цэнтры «Карона», які месьціцца на вуліцы Кальварыйскай у Менску, цалкам адсутнічае інфармацыя на беларускай мове. Робім туды запыт, на які прыходзіць адказ: маўляў, кіраўніцтва цэнтру абрала расейскую мову, і беларускамоўных грамадзян на іх роднай мове абслугоўваць не зьбіраецца. Дашліце карэспандэнта ў гэту краму, зрабіце рэпартаж, дапамажыце абараніць канстытуцыйнае права беларускага спажыўца.

Я згодны з Вамі, і для мяне таксама Янка Саламевіч ёсьць выдатны знаўца беларускай мовы, як і Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Вольга Іпатава, Уладзімер Арлоў, Пётра Садоўскі, Алесь Пашкевіч, Уладзімер Някляеў ды Андрэй Дынько.

У сувязі з гэтым хацеў бы даведацца, калі іх галасы зноў загучаць на дзяржаўным Беларускім радыё, асабліва ў жывым этэры, пра якія Вы так натхнёна пішаце?

Дзяржаўнае радыё я слухаю даволі часта. Аднойчы нават пачуў у перадачы Вашага журналіста, прысьвечанай беларускай архітэктуры, цэлы кавалак тэксту са сваёй кнігі, праўда, без аніякай спасылкі на аўтара. Але, як кажуць, і за гэта дзякуй.

Таксама 12 сакавіка прачытаў, разам з Вашым, ліст аднаго краязнаўцы і журналіста зь мястэчка Круглае, што на Магілёўшчыне. Між іншым, ён паведамляе, што іх раённае радыё цалкам расейскамоўнае. Можа, Вы, спадар Раманчук, зможаце дапамагчы сваім калегам на Круглянішчыне ўспомніць родную мову? Будзем Вам за гэта вельмі ўдзячныя.

А зараз наконт выступаў чыноўнікаў на Нацыянальным беларускім радыё на дзяржаўнай беларускай мове. За апошнія гады я чуў толькі двух чалавек. Можа, Вы зможаце папоўніць гэты сьпіс? Буду надзвычай удзячны. Неяк у пачатку верасьня чуў выступ міністра адукацыі. Як вы думаеце, на якой мове ён выступіў? Правільна. Хоць і з акцэнтам, але вельмі стараўся прамаўляць на мове суседняй дзяржавы. І ўсё было б добра, толькі ён заклікаў вучняў дапамагчы ва ўборцы з палёў не «картошкі», а бульбы. Чаму ж тады Вы так абрынуліся на спадара Янку Саламевіча? Зрэшты, такіх прыкладаў я магу прывесьці Вам безьліч.

Магчыма, таму Вы і даслалі мне адказ ажно на сямі старонках. Спадзяюся, што гэта гутарка пойдзе нашаму Нацыянальнаму радыё на карысьць, бо якая нацыя, такое і радыё. Гэта факт, які даказваць ня трэба.

Хачу таксама адзначыць, што беларускае радыё значна лепшае па форме і сутнасьці за беларускае тэлебачаньне, і гэта таксама бясспрэчны факт.

Зычу Вам плёну ў Вашай нялёгкай працы.

З павагай,

**Старшыня ТБМ Алег Трусаў**

* * *

**Прывітаньне з Англіі і пажаданьні наступнага стагодзьдзя існаваньня выдавецтву «Нашай Нівы».** Я заўсёды вельмі рады чытаць весткі з Бацькаўшчыны і ўсе навіны, якія ёсьць там, гэта як люстра жыцьця ў краіне, і дай Бог Вам вытрываласьці ў адданай працы на карысьць Беларусі.

Перайшоў на інтэрнэт і мушу прызнацца, што гэтая новая тэхналёгія мяне да гэтага часу не цікавіла, а цяпер у маім старым веку (82 гады) мне гэта вельмі падабаецца.

**Міхась Баяроўскі, Англія**

## Касута ёсьць

**У дваццаць дзявятым нумары «Дзеяслова» надрукаваны ўспаміны Леанілы Бортнік — жонкі кіраўніка антысавецкай арганізацыі Георгія Бортніка, сяброўкі СБМ, якая двойчы прайшла празь пекла ГУЛАГу.** Яна згадвае, што нарадзілася ў сям'і псаломшчыка ў вёсцы Касута на Вялейшчыне, і што вёскі гэтай «ужо няма на мапе, яна зьнесеная зь зямлі».

Насамрэч вёска Касута пазначаная на мапе Вялейшчыны і стаіць на той зямлі. У ёй нават захавалася царква Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла — мураўёўка 1868 г., у якой, відаць, і служыў бацька спадарыні Леанілы — А.В.Барадзін.

Цікава, што ў гэтай царкве быў ахрышчаны яшчэ адзін змагар з саветчынай — Расьціслаў Лапіцкі, пра лёс якога распавёў нядаўна ў сваіх кніжках Міхась Чарняўскі.

Вёска Касута ёсьць месцам нараджэньня Піліпа Орліка зь беларускага шляхецкага роду Навіна, украінскага дзяржаўнага дзеяча, паплечніка Мазепы, пасьля сьмерці якога быў абвешчаны гетманам.

Так і просіцца Касута важным пунктам у патрыятычную вандроўку з умоўным назовам «Змагары і пакутнікі», у маршрут якой можна ўлучыць Вялейку зь яе сумнавядомай турмой, Сэрвач — радавое гняздо Козелаў, актыўных удзельнікаў паўстаньня 1863—64, Куранец з Уладыкамі, дзе захаваліся магілы тых паўстанцаў, Ільлю — у навакольлі якой на пачатку 50-х змагаўся Філістовіч.

**Вячка Васілёнак, Менск**

## А нашых клясыкаў «Вежа» абышла ўвагай

**У гарадзкой бібліятэцы зьявіліся дзьве яркія кніжкі — «100 великих писателей» і «100 великих мастеров прозы».** Іх даслаў бібліятэцы так званы бібкалектар, дзе не пытаюць, што трэба, а чаго ня варта дасылаць, хоць цана кніжак 14—15 тысячаў рублёў кожная.

У двухтомніку знайшлося месца расейскім і савецкім пісьменьнікам — Буніну, Тургеневу, Ясеніну, Шолахаву, Салжаніцыну і іншым. Не забылі і пра літаратараў замежжа — Драйзэра, Кафку, Фіцджэральда. А вось нашым духоўным правадырам Купалу, Быкаву — ні ў адным з тамоў месца не знайшлося! Так і патыхнула ад згаданых выданьняў «Вежы» антыбеларускім душком часоў губэрнатара «Северо-западного края» Мураўёва.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



# Восень у Нясьвіжы

Апошняе сонца ў фотарэпартажы **Юліі Дарашкевіч**.







# Пэнсія мары

**Працяг са старонкі 2.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Чаго насамрэч хочуць пэнсіянэры? Чаго чакаюць ад пэнсіі тыя, хто яшчэ працуе? Што думаюць беларусы пра сучасную пэнсійную сыстэму? Што ім больш даспадобы — аддаць клопат пра сябе ў рукі дзяржавы, ці самім ашчаджаць на старасьць? Адказы на гэтыя і іншыя пытаньні экспэрт Дасьледчага цэнтру ІПМ Марына Батурчык шукала ў гутарках з удзельнікамі фокус-групаў.

## Пэнсійны шок

Як і варта было чакаць, людзі маладога веку (да 29 год) пра пэнсію ня дужа клапоцяцца — на першым пляне ў іх назапашваньне актываў, набыцьцё нерухомасьці, гадаваньне дзяцей. Моладзь пагладае ў будучыню з аптымізмам, спадзяецца ашчадзіць дастаткова грошай ды прычакаць прагрэсіўных пэнсійных рэформаў.

А вось людзі сярэдняга веку ацэньваюць выхад на «заслужаны адпачынак» як патэнцыйную праблему. «Боязь пэнсіі» мае масавы характар, найперш сярод тых, каго прынята лічыць «сярэдняй клясай», людзей, звыклых да пэўнага ўзроўню дабрабыту.

Цікавая сытуацыя назіраецца ў асяродку саміх пэнсіянэраў. Мізэрны памер пэнсіяў прымушае іх працягваць працу, таму фінансавыя цяжкасьці яны перажываюць ня так востра, як псыхалягічны дыскамфорт, пачуцьцё непатрэбнасьці, зьніжэньне самаацэнкі.

## Ідэальная пэнсія

Стэрэатып «абы вайны не было, ды каб бульба радзіла» не адпавядае ўяўленьням удзельнікаў фокус-групаў пра жыцьцё «ідэальнага пэнсіянэра». Яны з зайздрасьцю паглядаюць на бабуляў ды дзядуляў з заходніх краінаў, якія могуць сабе дазволіць весьці актыўны лад жыцьця, падарожнічаць, мець хобі. Што праўда, нават моладзь на такую пэрспэктыву мала разьлічвае, і была б радая мець у старасьці ўласнае жытло ды дастаткова грошай на прадукты, якаснае мэдычнае абслугоўваньне і лекі. Удзельнікі фокус-групаў лічаць, што пэнсія павінна складаць як найменш 65—70% ад заробку.

## Блытаніна ўяўленьняў

Як выявілася, удзельнікі дыскусіяў маюць павярхоўнае ды супярэчлівае ўяўленьне пра сучасную пэнсійную сыстэму ў Беларусі. Зьвесткі пра яе бяруцца ня з мэдыяў, а з гутарак са знаёмымі ды роднымі, з працоўнага досьведу. Для значнай часткі апытанай моладзі характэрнае «лятэнтнае ўспрыняцце пэнсійнай сыстэмы як назапашвальнай», адсутнасьць разуменьня таго, што іх пэнсійныя адлічэньні не назапашваюцца, а ўжо цяпер ідуць на выплату пэнсіяў іншым людзям.

Старэйшыя людзі добра разумеюць сутнасьць разьмеркавальнай і ашчаджальнай сыстэмаў і аддаюць перавагу апошняй: «Хай я мільён дзяржаве адлічыў, а пасьля — памёр, не пасьпеў нават вадзічкі папіць. А грошыкі сышлі, растварыліся. Чаму мае грошы павінныя некуды сыходзіць? Несправядліва!»

Асаблівасьць дыскусіі ў фокус-групе яскрава праявілася тады, калі ўдзельнікі пачалі разважаць, ці хапае дзяржаве грошай на пэнсійныя выплаты. Спачатку большасьць удзельнікаў была перакананая, што пэнсійнага фонду, якім валодае дзяржава, недастаткова для таго, каб выплачваць годныя пэнсіі. Але варта было аднаму ўдзельніку запярэчыць, выказаўшы ўпэўненасьць, што дзяржава ўсё ж акумулюе дастаткова грошай, але ня ўмее ці ня хоча з розумам імі распарадзіцца, як іншыя ўдзельнікі задумаліся, ці маюць яны рацыю.

## Што не падабаецца

Удзельнікі фокус-групаў адшукалі шмат хібаў у сучаснай беларускай пэнсійнай сыстэме. Галоўны — мізэрны памер дзяржаўнай пэнсіі, які не забясьпечвае годнае жыцьцё ў старасьці. Іншы недахоп — адсутнасьць дыфэрэнцыяцыі пры налічэньні пэнсіяў. Незалежна ад таго, як і колькі ты працаваў, усе атрымліваюць прыблізна аднолькавую пэнсію. Да таго ж, пэнсійная сыстэма нестабільная, як і ўся фінансавая сыстэма. Людзям бракуе ўпэўненасьці ў будучыні, а пэнсійны век больш высокі за працягласьць жыцьця. Даецца ў знакі і тарыфная сыстэма, якая абмяжоўвае заробкі, у выніку чаго тыя, хто хоча больш актыўна і эфэктыўна працаваць, не атрымліваюць больш грошай, а, значыцца, ня могуць рабіць большыя пэнсійныя адлічэньні.

Сярод старэйшага пакаленьня падвышэньне пэнсійнага ўзросту адназначна выклікае нэгатыўную рэакцыю. Людзі сярэдняга веку і пэнсіянэры таксама ў штыхі ўспрымаюць спробы абмежаваць магчымасьць працаваць на пэнсіі. Тое, што ў пэнсіянэраў, што працуюць, забіраюць 20% пэнсіі, яны лічаць дыскрымінацыяй: «Ён зарабіў на пэнсію, і гэта ягоны выбар — займацца хобі, садам-гародам ці працаваць далей».

**Што такое фокус-група?**

Марына Батурчык, аўтарка дасьледаваньня, абрала за мэтад працу з фокус-групамі. У адрозьненьне ад звычайнага анкетнага сацыялягічнага апытаньня, фокус-група ладзіцца ў фармаце жывой гутаркі. Цікава, што яе ўдзельнікі ўзаемадзейнічаюць ня толькі з дасьледчыкам, але і паміж сабой. Фокус-група дае магчымасьць праводзіць паглыблены аналіз праблемы, ня проста фіксаваць погляды, але і сачыць за тым, як меркаваньні зьмяняюцца ў працэсе дыскусіі. Агулам Марына Батурчык правяла гутаркі ў чатырох фокус-групах, кожная зь якіх адлюстроўвала пэўную ўзроставую катэгорыю насельніцтва: моладзь (18—29 год), сярэдні век (30—44 гады), перадпэнсійны век (45—55 год), пэнсіянэры (жанчыны старэйшыя за 55 год і мужчыны старэйшыя за 60 год).

## Міт пра высокую пэнсію

Усе ўдзельнікі фокус-групаў згаджаюцца, што дзяржава мусіць быць арбітрам фармаваньня пэнсійнай сыстэмы, усталёўваць асноўныя правілы гульні. Аднак цяпер, на іхнюю думку, яе роля гіпэртрафаваная: дзяржава «зьяўляецца суб'ектам, які валявым рашэньнем вызначае памер пэнсіяў». Людзям не даспадобы тое, што яны ня ведаюць, на якія мэты сапраўды выдаткоўваюцца іхная пэнсійныя адлічэньні.

Абсалютная нечаканасьць: моладзь і людзі сярэдняга веку лічаць, што ў сучасных умовах павелічэньне пэнсіяў непажаданае, бо можа прымусіць дзяржаву забраць грошы ў іншых сацыяльных групаў, падвысіць падаткі ды ў выніку прывядзе да росту цэнаў. На думку большасьці ўдзельнікаў дыскусіі, дзяржава магла б знайсьці сродкі на павелічэньне пэнсіяў, скараціўшы выдаткі на войска, дзяржапарат, сілавыя структуры, ды адмовіўшыся ад будоўлі аграгарадкоў ды спартовых комплексаў.

## Пэнсія як лятарэя

Людзі ня лічаць сучасную сыстэму пэнсійнага забесьпячэньня аптымальнай, а таму перакананыя, што зьмены ў ёй непазьбежныя — невядома толькі, калі яны адбудуцца, а гэта спараджае няўпэўненасьць у будучыні.

Усе ўдзельнікі разьлічваюць на мінімальную дзяржаўную пэнсію, і не зьбіраюцца адмаўляцца ад таго, каб сплачваць грошы ў фонд сацыяльнага страхаваньня. Ёсьць патаемнае спадзяваньне на тое, што ў будучыні нешта зьменіцца да лепшага, і дзяржава ўсё ж пачне даваць добрыя пэнсіі — гэтая надзея падобная да адчуваньня гульца ў лятарэю, які спадзяецца ў будучыні выцягнуць шчасьлівы білецік.

Удзельнікі сярэдняга веку спантанна загаварылі пра праблему «шэрых заробкаў». З аднаго боку, яны лічаць за лепшае ня сплачваць дадатковых пэнсійных унёскаў, зь іншага — бачаць небясьпеку атрымліваць грошы ў «капэрце» — маўляў, хто яго ведае, якая там будзе ў будучыні сытуацыя. Удзельнікі дапускаюць, што пэнсійная сыстэма можа зьмяніцца, і памер пэнсіі будзе ў значнай ступені залежаць ад памеру сёньняшніх сацыяльных унёскаў.

## Брак інфармацыі

Адметна, што ніхто ня лічыць магчымым мець пэнсію за адзіную крыніцу грошай для жыцьця. Аднак, калі людзі сталага веку і пэнсіянэры спадзяюцца найперш на падпрацоўкі ды, калі-нікалі, на магчымыя ашчаджэньні, то частка моладзі плянуе актыўна ўдзельнічаць у працэсе фармаваньня ўласнай пэнсіі: назапашваць грошы ў банках, засноўваць бізнэс і мець зь яго прыбытак, укладаць грошы ў пэнсійныя фонды. Праўда, у рэальнасьці яны часьцей за ўсё адкладаюць гэтую справу на сьвятое нікалі.

У сваёй большасьці ўдзельнікі разумеюць важнасьць ашчаджэньняў, але ня робяць іх. У першую чаргу таму, што няма даверу да фінансавай сыстэмы, і толькі ў другую — бо бракуе грошай. Калі б былі надзейныя гарантыі з боку дзяржавы ды страхаваньне рызыкі, дык усе ўдзельнікі былі б гатовыя рабіць ашчаджэньні. А так калі хто і адкладае грошы, дык не на пэнсію, а на «чорны дзень». Сярод фінансавых інстытутаў, якія яшчэ выклікаюць некаторы давер — «Беларусбанк» (апытаныя лічаць, што дзяржава ня дасьць «патануць» спадкаемцы савецкага Ашчадбанку) ды заходнія страхавыя кампаніі ды фонды.

Увогуле, удзельнікі фокус-групаў лічаць заходнюю пэнсійную сыстэму больш трывалай за беларускую. У нашай краіне нестабільная заканадаўчая база: адзін указ можа ўсё перакрэсьліць. А на Захадзе грошы працуюць, там існуе культура ашчаджэньня, можна рабіць доўгатэрміновыя пляны.

Цікава, што прысутнасьць у групе ўдзельніка, які рэальна робіць адлічэньні ў замежны пэнсійны фонд, спантанна выклікала трансфармацыю пазыцыяў і рост узроўню даверу да такіх фондаў. Пабачыўшы жывы прыклад, апытаныя пачалі выказваць большую гатоўнасьць да дадатковых ашчаджэньняў.

## Парады палітыкам

Дасьледаваньне Марыны Батурчык можна без перабольшаньня назваць сэнсацыйным — яно пераварочвае традыцыйнае ўяўленьне пра тое, што беларусы толькі і чакаюць, каб дзяржава «дала» ім пэнсію. Насамрэч людзі лічаць, што гэта яны самі зарабілі сабе на старасьць. Дзяржава, на іхную думку, ніякай ласкі ім ня робіць, а толькі разьмяркоўвае тыя грошы — прычым робіць гэта недасканала і часьцяком несправядліва. Людзі цэняць сваю працу і чакаюць таго самага ад дзяржавы, але бачаць нешта зусім іншае: працуюць усе па-рознаму, а пэнсія ўсіх чэша пад адзін грабеньчык.

Дасьледаваньне сьведчыць, што «электарат» марыць ня толькі пра «чарку ды скварку», але і пра паўнавартаснае жыцьцё ў старасьці, уключна з вандроўкамі ды заняткамі ёгай. Лад жыцьця заходніх пэнсіянэраў уяўляецца ідэальным, хоць і недасяжным. Калі беларусы і ня робяць дадатковых пэнсійных ашчаджэньняў, то гэтая пасіўнасьць тлумачыцца ня тым, што яны маюць абмежаваныя жаданьні (гэта ня так), а адсутнасьцю ўпэўненасьці ў будучыні і браку інфармацыі: людзі баяцца, што грошы «згараць».

«У прадстаўнікоў усіх узроставых групаў ёсьць патрэба ў існаваньні недзяржаўных фінансавых інстытуцыяў і сыстэмы, якая дазваляе працаўніку рабіць дадатковыя пэнсійныя ашчаджэньні, — робіць выснову дасьледчыца. —У цэлым, нягледзячы на агульны высокі ўзровень скепсісу ды недаверу, удзельнікі прадэманстравалі патрэбу больш актыўна, чым гэта магчыма ва ўмовах пэнсійнай сыстэмы, што існуе ў Беларусі, удзельнічаць у працэсе фармаваньня пэнсіяў».

Праведзены Дасьледчым цэнтрам ІПМ аналіз успрыняцьця пэнсійнай сыстэмы — гатовы матэрыял для палітыкаў: проста бяры ды закладай галоўныя высновы ў перадвыбарныя праграмы. Гэтак, зрабіўшы пэнсійную сыстэму больш празрыстай, улада магла б набраць сабе дадатковыя балы падтрымкі. Што да апазыцыі, дык ёй можна больш сьмела закідаць у масы прапановы па правядзеньні пэнсійнай рэформы — людзі яе чакаюць. І першым і другім банальнае абяцаньне падвысіць пэнсіі ня дасьць дадатковых козыраў у рукі. Сёньня людзям важна ня толькі само падвышэньне пэнсіяў, але і той кошт, якім яно будзе дасягнутае. Выбарцы пазытыўна ўспрымуць выкладзеную праграму пераходу ад сучаснай разьмеркавальнай да ашчаджальнай пэнсійнай сыстэмы — але толькі ў тым выпадку, калі пераканаюцца, што гэта не чарговы падман. Важны і такі нюанс: замест таго, каб зацыклівацца на памерах пэнсіяў, варта прапаноўваць шляхі для стварэньня паўнавартаснай рэінтэграцыі старых людзей у грамадзтва. Людзі баяцца пэнсіі, як чорта, і будуць удзячныя таму, хто здолее пазбавіць іх гэтага страху.

**Алесь Кудрыцкі паводле матэрыялаў Дасьледчага цэнтру ІПМ**

# У Расеі безь пераменаў

Незалежна ад таго, японскую ці мэксыканскую мадэль палітычнай сыстэмы выбралі для сябе пуцінцы, Масква ня зьменіць сваёй палітыкі ў Беларусі. Беларускаму васалу можна плаціць менш, але так, каб не дапусьціць крызіснага ўзроўню. Піша **Андрэй Ляховіч**.

Імкнуцца прадбачыць разьвіцьцё палітычных працэсаў — амаль тое самае, як даваць прагнозы надвор’я. Ва ўмовах дынамічнай рэчаіснасьці ўсё можа зьмяніцца. Аднак, калі з часам адбываюцца падзеі, зьвязаныя лёгікай, імавернасьць палітычных прагнозаў павялічваецца. Прагдядаюцца тэндэнцыі.

13 верасьня 2007 г. прэзыдэнт Расеі У.Пуцін прызначыў прэм’ер-міністрам Віктара Зубкова. 14 верасьня кандыдатура Зубкова бала зацьверджаная Дзяржаўнай Думай. Гэта азначае канец інтрыгі, якая прыцягвала ўвагу шмат часу. Імя пераемніка Пуціна стала вядома: гэта Зубкоў.

## Зубкоў — пераемнік

Зубкоў — выхадзец зь піцерскай каманды У.Пуціна. Да прызначэньня дырэктарам Фэдэральнай службы фінансавага маніторынгу, г.зн. фінансавай выведкі, Зубкоў займаў кіроўныя пасады ў мэрыі Санкт-Пецярбургу, працаваў там з Пуціным.

Вывучаючы палітычна-псыхалягічны партрэт Зубкова, можна прыйсьці да высновы, што Зубкоў падобны да Пуціна ў тым сэнсе, што гэта чалавек, які «не здае сваіх». Ён ня здасьць Пуціна. Будзе дзейнічаць у межах кантракту з Пуціным і ягонай камандай. Таксама, як раней Пуцін ня «здаў» Б.Ельцына, А.Сабчака, выконваў «кантракт» зь Ельцыным.

Адначасова Зубкоў — сталы спрактыкаваны чалавек. Выхадзец з расейскай глыбінкі, вёскі. Для яго прызначэньне прэм’ер-міністрам, ня кажучы пра пасаду прэзыдэнта, — гэта вяршыня палітычнай кар’еры, магчымасьць упісаць сваё імя ў палітычную гісторыю Расеі.

Зубкова атачаюць «людзі Пуціна». Гэта таксама стварае адпаведныя гарантыі падкантрольнасьці Зубкова Пуціну.

В.Зубкоў цягам пяці гадоў узначальваў фінансавую выведку. Ён быў прызначаны Пуціным на гэтую пасаду для стварэньня дадатковага вагара кантролю над палітычнай элітай і бізнэс-суполкай Расеі. Мае кампрамат на вельмі многіх і пры неабходнасьці можа выкарыстаць нават саму пагрозу выкарыстаньня кампрамату.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Антыпуцінскі мітынг у Маскве.**

У адрозьненьне ад Украіны, дзе існуюць некалькі фінансава-прамысловых групаў, якія выкарыстоўваюць палітыку, палітычны ўплыў як інструмэнт для перадзелу рынку, у Расеі пры Пуціне была створаная сыстэма ўлады-ўласнасьці, якая выключае прэтэнзіі канкурэнтнай фінансава-прамысловай групы на вярхоўную ўладу. Пасьля «справы Хадаркоўскага» ў 2003 г., судовага перасьледу шэрагу алігархаў, каманда чыноўнікаў і алігархаў, якую ўзначальвае Пуцін, займае дамінуючыя пазыцыі ў сыстэме ўлады-ўласнасьці, мае ў сваіх руках усе вагары палітычнага ўплыву (дзяржаўны апарат, мэдыі). Каманда Пуціна на доўгую пэрспэктыву будзе вызначаць палітычны курс Расеі.

## Пуцін застаецца

2-га кастрычніка на 8-ым зьезьдзе «Адзінай Расеі» Пуцін прыняў прапанову ўзначаліць выбарчы сьпіс «партыі ўлады» на парлямэнцкіх выбарах.

Сэнс падзеі вельмі добра растлумачыў намесьнік старшыні парлямэнцкай фракцыі «Адзінай Расеі» В.Валодзін: «Уладзімер Пуцін вызначыў стратэгічнае разьвіцьцё Расеі. Пуцін застаецца. Значыць, усё добрае, што ён зрабіў, застаецца». Быў зроблены і адпаведны прыгожы вобраз таго, як Пуцін застаецца. Выбарчыя сьпісы «Адзінай Расеі», у якіх пад нумарам адзін быў адзначаны Пуцін, у ЦВК прынесла прыгажуня ў чырвонай футболцы, зь лічбай 1 на сьпіне і надпісам буйнымі літарамі: У.Пуцін. Такім чынам, Пуцін застаўся не як асобны палітык, а як фактычны кіраўнік усёй сыстэмы ўлады — выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады, прадстаўленай «басманным правасудзьдзем».

Узначаліўшы выбарчы сьпіс «Адзінай Расеі», якая пераможа на парлямэнцкіх «выбарах», Пуцін можа выбіраць: заняць пасаду сьпікера парлямэнту, прэм’ер-міністра альбо шэрага кардынала. Ён ужо ўзначальваў урад у пэрыяд жнівень-сьнежань 1999 г.

Пры ўсіх сцэнарах, маючы рэйтынг на ўзроўні 70% і больш, стварыўшы сваю каманду, Пуцін застаецца гаспадаром сытуацыі.

## Пэрспэктывы беларуска-расейскіх адносінаў

Для Беларусі такі сцэнар будзе азначаць, што не адбудзецца значных зьменаў у палітычным курсе Расеі, у тым ліку адносна Беларусі. Расея лічыць, што Лукашэнка сам сябе загнаў у кут, ня мае магчымасьцяў адказаць на ціск зь яе боку. У гэтых умовах Масква лічыць, што за выкананьне «шчыта», стратэгічнага саюзьніка, Беларусі можна плаціць менш, самой вызначаць, колькі плаціць і за што. Памер эканамічнай падтрымкі будзе скарачацца. Але ўсе ж такі да някрызіснага ўзроўню.

Расея будзе ціснуць на Лукашэнку з мэтай дабіцца ад яго саступак у пытаньні пакупкі расейскімі кампаніямі кантрольных пакетаў акцыяў найбольш важных прадпрыемстваў. Яшчэ ў траўні 2001 г. тагачасны расейскі прэм’ер М. Касьянаў называў 30 прадпрыемстваў, якія хоча набыць расейскі бізнэс. Такім чынам, Расея будзе імкнуцца ўзмацніць свае эканамічныя і палітычныя пазыцыі ў Беларусі, надзейна прывязаць да сябе.

Пасьля ўсталяваньня кантролю над энэргетычным сэктарам, вялікай часткі эканомікі, будзе ўжо больш магчымасьцяў увесьці расейскі рубель і значыць, кантраляваць фінансавую сыстэму, усю эканоміку. Пасьля чаго, пры ўмове захаваньня цяперашніх тэндэнцыяў у адносінах Расеі з Захадам, вельмі імаверна, што зноў актуалізуецца пытаньне пашырэньня расейскай вайсковай прысутнасьці ў Беларусі.

Беларусам будуць тады казаць, што гэта таксама абсалютна рынкавы падыход: расейскія інвэстыцыі ў эканоміку Беларусі трэба будзе абараняць, падмацаваць адпаведным разьвіцьцём палітычнай і ваеннай «інтэграцыі».

Аднак існуюць аб’ектыўныя абмежаваньні ціску на Беларусь з боку Расеі. Першае. Можна зноў істотна ўскладніць сувязь Расеі зь яе Калінінградзкім анклявам. Другое. Калі ня будуць заключаныя пагадненьні пра кошт на газ на прымальных умовах, Лукашэнка зноў будзе адбіраць газ з экспартнага трубапроваду: на 2008 г. Расея яшчэ не атрымае магчымасьцяў перанакіраваць адпаведны аб’ем газу эўрапейскім спажыўцам, мінуючы Беларусь. Трэцяе, мабыць, самае істотнае. Лукашэнка можа паставіць перад Расеяй геапалітычныя пытаньні (СПА, пэрспэктыва будаўніцтва ў Польшчы і Чэхіі аб’ектаў ПРА ЗША, прасоўваньне на ўсход ваеннай інфраструктуры НАТА, інтэграцыя ў НАТА Грузіі і Украіны і г.д.). Ня маючы адказу на пытаньне, хто, калі не Лукашэнка, будзе забясьпечваць гэтыя інтарэсы, Расея ня можа спыніць эканамічную падтрымку.

## Расея і Захад

Рэалізацыя праграмы доўгатэрміновага кіраваньньня Пуціна будзе зьяўляцца дадатковым фактарам ўскладненьня адносінаў Расеі з Захадам. Таму што зьявяцца дадатковыя падставы меркаваць пра разьвіцьцё аўтарытарных тэндэнцыяў у Расеі. Пры ўхіленьні ад дэмакратычных стандартаў Расея становіцца для Захаду ўсё больш непразрыстым, непрадказальным партнэрам. Галоўным чынам ідзе гаворка пра ўскладненьне ў палітычных адносінах пры значным інфармацыйным супрацьстаяньні. На гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве гэта не адаб’ецца. Будуць раздавацца галасы пра неабходнасьць выключэньня Расеі з «G8» і замены яе Індыяй і Бразыліяй.

Падчас кіраўніцтва Пуціна грамадзкая думка рыхтавалася для таго, каб «правільна» адрэагаваць на абвінавачваньні Захаду ў аўтарытарызьме. Напрыклад, 30 верасьня расейскія тэлеканалы перадавалі, што «ЦРУ мае стратэгію раздрабленьня Расеі да 2012 г.», што «зьмяняецца характар дзейнасьці НАТА, НАТА стала інструмэнтам стрымліваньня, аслабленьня Расеі». У той жа дзень была паказаная шырока анансаваная аўтарская праграма папулярнага ў Расеі тэлежурналіста А.Мамантава «Бархат.ru», дзе Захад абвінавачваўся ў падрыхтоўцы «аксамітнай» рэвалюцыі ў Расеі. Гэта адзін з фрагмэнтаў інфармацыйнага забесьпячэньня «пляну Пуціна».

# Алесь Мазанік: «Гаворыш па-беларуску? Табе зьніжка!»

Досыць рана я вырашыў: як толькі стану паўналетнім, я пачну размаўляць па–беларуску і з гэтага ж дня пачну сам зарабляць сабе на жыцьцё. З карэспандэнтам «НН» гутарыць **Алесь Мазанік**, юнак з роду знакамітай Алены Мазанік.

Ад дажджу мы з Алесем Мазанікам — чалавекам вельмі маладым (яму дваццаць адзін год), але ўжо вельмі вядомым — вырашылі схавацца ў «Старавіленскай карчме». Афіцыянтку нашая беларуская мова прывяла ў ступар. Мы не прамаўлялі клясычнага «я сказаў — гарбаты!», але і просьба прынесьці кавы з цукрам, вымаўленая выразна і галосна, аказалася вышэй ейнага разуменьня. Яна толькі зьбянтэжана лыпала вялікімі цёмнымі вачыма.

— І адкуль такія бяруцца? — задала я досыць рытарычнае пытаньне замест прыгатаванага — пра дыск зь беларускім софтам, калі няшчаснае дзяўчо нарэшце паляцела па памянёную каву. — Ну, як можна не разумець па-беларуску? Я ўжо не кажу — гаварыць, няхай, але кім трэ быць, каб не разумець?

— Або прыежджая зь іншай краіны, або прыежджая зь вёскі, — выказаў меркаваньне Алесь. — І вось парадокс: я ня раз заўважаў, што людзі, якія прыяжджаюць на Беларусь зь іншых дзяржаваў — Расеі, Украіны, Польшчы — імкнуцца вывучыць нашу мову, а вось прыежджыя зь беларускай вёскі — хочуць мову забыць. Яны бачаць навокал шмат расейскамоўных шыльдаў, чуюць расейскую на вуліцах і проста «выключаюць» беларускую.

— А вы заўсёды размаўляеце па-беларуску?

— Імкнуся, але здараюцца выпадкі, калі дзеля хуткасьці разуменьня даводзіцца карыстацца расейскай, але я лічу, што лепей ведаць дзьве мовы, чым адну.

— А як прыйшлі да беларускамоўнасьці вы? У вас гэта зь сям'і?

— Хутчэй не. Але склалася так, што досыць рана я вырашыў: у васямнаццаць



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

гадоў, стаўшы паўнагадовым, я пачну размаўляць па-беларуску і з гэтага ж часу пачну сам зарабляць сабе на жыцьцё. На маё рашэньне паўплываў Зьмітрусь Аўсяньнікаў, менавіта ён увёў мяне ў сьвет беларускасьці, першым назваў мяне *Алесем!* Шмат хто пад'ялдыкваў мяне, але блізкія падтрымалі. Яны разумелі маё жаданьне быць самастойным і маё меркаваньне, што гаварыць па-беларуску — гэта правільна. Што правільна *быць беларусам*. Што ў беларускасьці ёсьць *сапраўднасьць*. Што насамрэч я ня Саша, а Алесь. І вось на працягу трох гадоў, ад верасьня 2004 году, я імкнуся размаўляць толькі й выключна па-беларуску, а таксама зарабляць самастойна, каб не сядзець на шыі ў бацькоў, стаць на свае ногі і ў свой час мець магчымасьць стварыць сям'ю. Мне пашанцавала ў тым, што некалькі гадоў таму я ўладкаваўся на кніжны кірмаш на Янкі Купалы, 27, што мой шэф, Раман Сьвірскі, у якога я цяпер працую, таксама беларускамоўны. Ён падтрымаў мяне ў тым, каб стварыць кропку, дзе будзе прадавацца выключна беларускамоўная музыка й літаратура на мове нашых продкаў. Такая кропка адзіная на вялізным кірмашы.

— Вам фінанасава выгадна займацца продажам менавіта беларускамоўных кніг, беларускай музыкі?

— Скажам так: гэта прыносіць ня меншы даход, чым продаж расейскамоўнай літаратуры і небеларускай музыкі. З гэтага можна жыць. Дзякуючы чаму цяпер мара маіх бацькоў пра ўнукаў, здаецца, блізкая да ўвасабленьня.

— У вас ёсьць дзяўчына, вы зьбіраецеся пабрацца?

— Так, ёсьць (*твар цяплее*). Тацяна-soNca. Яна таксама беларускамоўная, менавіта яна — дызайнэр вокладкі дыску зь беларускім софтам, які я выпусьціў.

— Вокладка выйшла вельмі стылёвая. Наагул, такія дыскі выходзяць ня кожны дзень. Раскажыце пра яго падрабязьней.

— Пачну з таго, што я лічу вельмі важным працаваць менавіта на Купалы, 27. І вельмі важна, што гэтыя шараговыя, звычайныя абсалютна людзі бачаць беларускія кнігі і дыскі, чуюць беларускае слова — няхай пакуль і ў адной кропцы. Дарэчы, людзям, якія гавораць са мной па-беларуску, я раблю зьніжку (*сьмяецца*). І такіх прыкладна 75 адсоткаў ад тых, хто да мяне прыходзіць!

Ідэя зрабіць дыск зь беларусізаванымі праграмамі нарадзілася з таго, што я добра ведаю, якое месца ў жыцьці цяпер займае кампутар. Народ цікавіцца кампутарнымі гульнямі, кампутарнымі праграмамі, і вельмі важна, каб такія рэчы існавалі па-беларуску. На дыску сабраныя каля 200 самых розных беларусізаваных праграмаў, слоўнікі, рэфэраты. Вялікія разьдзелы — праграмы для мабільнікаў, пераклады гульняў, праграмы-перакладчыкі. Гэты дыск дапаможа цалкам беларусізаваць кампутар.

— Дарагі Алесь, я паглядзела ваш дыск. Мне падалося, што сабранымі там рэчамі, хутчэй за ўсё, будуць карыстацца якраз тыя, каго ні ў чым ня трэба пераконваць. Але ведаеце, якая думка ў мяне ўзьнікла, калі я праглядала «стралялку» па-беларуску? Каб беларускія ўлады даўмеліся абавязаць прадаваць падобныя гульні ці фільмы толькі з наяўнасьцю беларускага перакладу, каб пакупнік сам мог выбіраць мову (як раней абавязалі радыёстанцыі круціць 75 адсоткаў беларускай музыкі), то ўяўляеце, колькі грошай дадаткова пацякло б у казну? Пераклады ж, вядома, рабілі б дзяржаўныя ўстановы, як найлепшыя знаўцы беларускай... Ды з такімі грашыма нам ніякія кошты на газ не былі б страшныя!

— Дык падорым ім гэтую ідэю! (*Сьмяемся*)

— А як, дарэчы, вы вырашылі пытаньне аўтарскіх правоў?

— Большасьць сабраных тут прадуктаў ёсьць у адкрытым доступе ў інтэрнэце, але карыстальніку нашмат больш зручна карыстацца дыскам, чым шукаць і спампоўваць гэтыя рэчы з інтэрнэту. Мы імкнуліся зьвязацца з усімі аўтарамі, зь якімі ўдалося, і атрымалі ад іх дазвол на выкарыстаньне прадуктаў. Калі ж у каго з аўтараў, зь якімі мы зьвязацца не змаглі, узьнікнуць пытаньні — я гатовы зь імі сустрэцца. Мой тэлефон ёсьць на дыску. Сам я займаўся мэнэджмэнтам дыску, працу па кампіляцыі праграмаў рабіў Уладзіслаў-Дракула. Дарэчы, гэты дыск рабіўся толькі на мае ўласныя сродкі.

— Што, акрамя гэтага дыску, вы прапануеце пакупнікам цяпер?

— У мяне заўсёды вялікі выбар кнігаў. Добра купляюцца кнігі «Беларускага кнігазбору», цікавяць чытачоў выданьні з сэрыі «Кнігарня «Нашай Нівы»... Музыкі таксама шмат. Нядаўна ў мяне закупляўся музычнымі дыскамі дырэктар «Аўтарадыё»... Дарэчы, чамусьці ў мяне рэдка пытаюцца пра дыскі «75-адсотнікаў», Дарафеевай, Смолавай, Агурбаш і да гэтага, затое часта пытаюцца пра N.R.M., Вайцюшкевіча, Тройцу... Некаторыя людзі прыходзяць да мяне ня толькі для таго, каб нешта набыць, але і для таго, каб проста паразмаўляць па-беларуску. Тая прадукцыя, літаратура й дыскі, якую я прадаю, выдадзеная легальна. Не прадаю, скажам, кніжку Шарамета, за якую, па-мойму, можна атрымаць ня толькі 15 месяцаў, але і 15 год. Я не лічу вартым займацца такой літаратурай. Яна запатрабаваная, але мая задача ня ў тым, каб трапіць у пастарунак, а ў тым, каб стала прапагандаваць беларускае.

— Вы маеце досьвед працы ў грамадзкіх арганізацыях. Які ён, хутчэй станоўчы ці хутчэй адмоўны?

— Толькі станоўчы! Але асабіста мне прасьцей працаваць самому, чым у межах нейкай арганізацыі, нейкай партыі. Кожнаму сваё.

— Астатнім — чужое! А што вы чытаеце самі? Выпісваеце якія газэты, ці вам досыць таго, што прадаяце?

— Адзначу, што кніжкі, якія я прадаю, маю і ў сваёй прыватнай калекцыі. Даволі даўно працую з «Нашай Нівай». На жаль, беларускія мэдыі маюць абмежаваную колькасьць чытачоў. Як распаўсюднік, магу параіць газэце час ад часу рабіць акцыі бясплатнага распаўсюду. Друкаваць ня дзьве з паловай тысячы экзэмпляраў, а, скажам, 10000 і раскідваць у паштовыя скрыні, раздаваць на вуліцах... Бо пра тое, што гэтая шыкоўная газэта цяпер, пасьля ўсіх забаронаў, яшчэ выдаецца, на жаль, ведаюць нямногія, і трэба пастарацца кола чытачоў пашырыць.

— Не магу не задаць вам пытаньне пра вашу знакамітую сваячку Алену Мазанік. Як усё ж лепш дзейнічаць: так, як яна, ці так, як вы?

— Цяжка сказаць, мне да яе шчэ далёка. Але, прынамсі, у нас ёсьць нешта супольнае.

— Так! Зьнешнасьць. Вы да яе вельмі падобныя зьнешне.

— Як я ведаю, яна даводзіцца мне траюраднай бабуляй. Яна рабіла сваю справу, я раблю сваю. Раблю так, як магу. Раблю так, каб мог з годнасьцю адказаць сваім будучым дзецям на пытаньне: а што ты, тата, зрабіў дзеля нас, дзеля нашай будучыні? Няхай гэта гучыць патасна, але я так жыву.

**Наталка Бабіна**

# Беларуская спэцыфіка тэлегульняў

Арганізатары «Аднаго супраць усіх» пакуль не зразумелі, што менавіта пытаньні на беларускую тэматыку — іх залаты фонд. Піша **Ягор Марціновіч.**

На працягу ўсяго лета АНТ круціла анонс новага інтэлектуальна-забаўляльнага шоў. Правілаў новага праекту ня ведаў ніхто, але, казалі, гэта штосьці падобнае да «Хто хоча стаць мільянэрам?», толькі зробленае ў Менску. Калі распавесьці ў двух словах, то гулец мае ў студыі 50 супернікаў. Грошы атрымае толькі адзін. Спыняцца на падрабязнасьцях няма патрэбы. Хто захоча, уключыць тэлевізар і ўбачыць. Тым ня менш, першая спроба здымак інтэлектуальнага шоў на заходні манер у Беларусі — нагода для разважаньня. Ці можам мы выбабляць якасны прадукт эўрапейскага ўзроўню?

Да працы прадусараў, рэжысэраў, апэратараў прэтэнзіяў няма. Пераключэньне камэраў, пусканьне дыму — азы іхных прафэсіяў, якіх дастаткова для стварэньня прыстойнай карцінкі.

Праблема ў гульцах. Ёсьць розьніца між стаўленьнем да гульні нашых суайчыньнікаў і замежнікаў. Асноўны складнік капітал-шоў — фінансавы. Людзей вабяць грошы. Але ва Ўкраіне, у Расеі грамадзяне прыходзяць у шоў яшчэ і паказацца ўсёй краіне — пажартаваць зь вядоўцамі, распавесьці пра сябе, прэзэнтаваць сваю групу падтрымкі. Яны прыходзяць на ГУЛЬНЮ. Беларусы ж імкнуцца незаўважна прабрацца на перадачу і ўхапіць грошы.

Беларускае грамадзтва ўспрымае любую такую праграму як аналяг лято, толькі з інтэлектуальнай афарбоўкай. Гэткая ж магчымасьць чалавеку з глыбінкі атрымаць шалёныя грошы. Шанец, які даецца раз у жыцьці, жар-птушка, на якую можна заглядзецца і адпусьціць, а можна пасьпець ухапіць.

У падсьвядомасьці мы разумеем, што не заслугоўваем гэткай халявы — ну, хіба даюць пяць мільёнаў за адказы на пытаньні школьнага ўзроўню? У тыповага беларуса адразу спрацоўвае

# Складанае мастацтва кампрамісу-2

Артыкул Данілы Жукоўскага «ЬЬЬ» у многім удала і па-новаму ставіць некаторыя, раней абмеркаваныя, пытаньні. Ня буду тут спыняцца на важных думках і фармулёўках аўтара, пакажу толькі на адзін спрэчны момант: пытаньне пра «саступкі супраціўнага боку», якіх чакае аўтар. Дый ня ён адзін.

Вось і ў допісе Henika Lojki згадваецца магчымасьць (у дадзеным выпадку, праўда, якраз не*магчымасьць*) таго, што ў адным памяшканьні сядуць «нашы і акадэмічныя мовазнаўцы». Здаецца, Жукоўскі і Лойка хацелі б нейкай задэманстраванай згоды і «саступак» з боку адной з канкуруючых партый. У 1993 годзе ў 16-м нумары «Нашай Нівы» пад загалоўкам «Ад рэдакцыі» (верагодна, рукою Дубаўца) было напісана наступнае (далей вылучана і дададзена ўсюды мною. — С.З.): «Гутарка йдзе **зусім не пра мяккія знакі (sic!)** й падобнае, а — **пра склад камісіі** й выніковы дакумэнт. Думаю, калі б нейкая «кааліцыйная» камісія — з **роўным удзелам прадстаўнікоў усіх асноўных пунктаў гледжаньня** — прыняла шырока аргумэнтаваную, пагодженую, усебаковую праграму, дзе высновай было б «нічога зьмяняць ня трэба!» (калі такое магчыма) — дык **такую праграму прынялі б усе, у тым ліку й сама мова (sic!)**». І ў 2003 годзе напярэдадні сходу дэмакратычных сілаў рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько хацеў, каб на сходзе быў дадзены старт «аўтарытэтнай **уніфікацыі** беларускіх правапісаў» (НН. 2003. 14 сакавіка). Ды што там: нават З.Саўка на разьвітаньне пасьля круглага стала ў ТБМ сказаў журналістам, што гэта толькі пачатак «нашай супольнай» (чытай: з Інстытутам мовазнаўства) працы.

Ці выйдзе што з жаданьня атрымаць «саступкі»?

Зрэшты: хто каму мае саступаць?

Здаецца, найпрасьцей ідэнтыфікаваць удзельнікаў эвэнтуальнай «правапіснай згоды» можна было б у выпадку фармулёўкі Henika Lojki: за перамоўным сталом павінныя апынуцца **«нашы»** і **«акадэмічныя»** мовазнаўцы. «Нашы» — гэта, ясна, Вячорка і Саўка. Праўда, магчыма, яшчэ С.Богдан захоча стаць непасрэдным удзельнікам «арфаграфічнай зьдзелкі»: як-ніяк, ён добра паказаў сябе як «наш» мовазнаўца падчас нядаўняй дыскусіі. А можа, і не захоча... Ці будзе прадстаўляць «нашых» мовазнаўцаў Сяргей Шупа? А Юрась Бушлякоў? А Зьміцер Санько? А Янка Запруднік? Як можна здагадацца, «супраціўны» («акадэмічны») бок будзе (можа) раўніва сачыць за тым, хто будзе выказваць пазыцыю «клясыкаў», і колькі будзе такіх прадстаўнікоў.

Здавалася б, нескладана ідэнтыфікаваць «акадэмічную» партыю. Нумар першы тут, у сьпісе, напэўна, Аляксандар Лукашанец. Але хто яшчэ? Віктар Іўчанкаў? Але ён ня мае дачыненьня да Акадэміі. То, значыць, Вераніка Курцова, якая была разам з Лукашанцам на паседжаньні «круглага стала»? Але яна правапісам не займаецца... Ці Алена Анісім (вяла паседжаньне «круглага стала»)? Але яна не выказвала нейкай адмысловай «акадэмічнай» пазыцыі... Значыць, Генадзь Цыхун? Але ён мае свой погляд на наяўную сытуацыю...

Аднак ці ёсьць вартыя ўвагі мовазнаўцы па-за межамі акрэсьленых вышэй асяродкаў «нашых» і «акадэмічных»? Ці клікаць Дубаўца? Вось жа ён у 1993 годзе пісаў пра «роўны ўдзел прадстаўнікоў усіх асноўных пунктаў гледжаньня» (заўважу: «прадстаўнікоў пунктаў гледжаньня», а не «мовазнаўцаў»). Яшчэ пару гадоў таму прыхільнікі «клясыкі», напэўна, маглі б уключыць Дубаўца ў склад «нашай» партыі; цяпер, напэўна, яны гэтага ня зробяць... Ці, напісаўшы «здрадніцкі» артыкул, Дубавец перастаў мець нейкі аўтарытэтны пункт гледжаньня? А можа, яго захочуць трымаць за «свайго» «акадэмічныя»?

А ці не захоча быць прадстаўленым на «правапісным гандлі» Саюз пісьменьнікаў (першы ці другі)? А рэдактары «Нашай Нівы», «Архэ»,

інстынкт — схапіць выйгрыш і зьбегчы, пакуль не адабралі. Праз гэта перадача губляе інтрыгу — амаль ніхто ня хоча рызыкаваць, бяз рызыкі адсутнічае азарт, без азарту няма самога шоў.

Пакуль людзі звыкнуцца, што, выкарыстаўшы школьную адукацыю і агульны кругагляд, зарабіць неблагія грошы можа кожны, пройдзе шмат часу.

Іншы недахоп можна сфармуляваць як недабеларускасьць шоў. Дзіўна было б чакаць, каб вядоўца Георгі Калдун раптам загаварыў па-беларуску альбо каб у якасьці спэцыяльна запрошаных гасьцей у студыі апынуліся Хадановіч ці Вольскі.

Складаецца ўражаньне, што кампутарная база пытаньняў для шоў была закупленая ў Расеі. Яна адаптаваная для нашых усходніх суседзяў, утрымлівае інфармацыю пра іхную гісторыю, традыцыі і культуру. Гэтыя зьвесткі не зьяўляюцца адкрыцьцём для беларусаў. Нашая краіна ведае Мініна з Пажарскім як герояў, але ў большасьці сваёй не адчувае розьніцы паміж Радзівіламі і Агінскімі.

На жаль, пакуль арганізатары «Аднаго супраць усіх» не зразумелі, што менавіта «тутэйшыя» пытаньні — гэта іхны залаты фонд. Пытаньні, зьвязаныя з гісторыяй Беларусі ці нашымі вядомымі суайчыньнікамі, пры ўяўнай іх лёгкасьці, прымушаюць гульцоў рабіць шмат намаганьняў для таго, каб даць правільны адказ.

Большасьць удзельнікаў гульні сталага веку, якія атрымалі беларускую сярэднюю адукацыю, ня ў стане адказаць на пытаньне: «Як называлася першая кніга, выдадзеная Скарынам?» Гэта дазваляе адкінуць частку гульцоў з розыгрышу. Чым менш застаецца гульцоў — тым мацнейшая інтрыга шоў і тым большы рэйтынг перадачы. Як кажуць, дару ідэю.

Першы здымачны дзень адзначыўся адзіным стоадсоткава беларусім пытаньнем — тым самым пра Скарыну. Але пры гэтым праскочыла інфармацыя пра першага расейскага нобэлеўскага ляўрэата, пра Суворава, пра помнік Пятру I…

Такія шоў патрэбныя. Гэта і чарговая прыступка ў разьвіцьці айчыннага тэлебачаньня — калі ўжо адмовіліся ад расейскага прадукту, трэба спрабаваць ствараць нешта сваё. Гэта і мінімальная, але карысьць для грамадзтва. Седзячы ў фатэлі насупраць улюбёнай блакітнай скрыні і даючы правільныя адказы хутчэй за гульца ў этэры, чалавек таксама атрымае пазытыўныя эмоцыі. І разам з тым, нарэшце, дазнаецца, як усё ж называлася першая Скарынава кніжка.

* * *

«Роднага слова», «Звязды», «Нівы»? А рэдактары выдавецтваў а, б, в і г? А прадстаўнікі радыё? А ці ёсьць мовазнаўцы ў БДУ? (Паводле «народнага акадэміка» Саўкі, такіх няма, але гэта ня ўсім відавочна). А ў Гомельскім унівэрсытэце? А ў Гарадзенскім? А ці захочам выслухаць П.Садоўскага? А настаўнікаў?

Аднак, уявім сабе, што нехта ўзяўся пасьпяхова разьвязаць усе «кадравыя» пытаньні будучай кампраміснай сустрэчы і пасьпяхова справіўся са сваёй задачай. Тады паўстае пытаньне парадку дня такога пагаджальнага форуму. Ён, як відаць, будзе выглядаць наступным чынам:

Якія канкрэтныя моўныя рысы павінныя «здаць» прадстаўнікі «акадэмічных» мовазнаўцаў, каб прадстаўнікі «клясыкаў» задаволіліся гэтымі саступкамі і перайшлі на «новы», «узгоднены» правапіс?

Калі б дырэктарам Інстытуту мовазнаўства быў я, то я адмовіўся б працаваць з такім парадкам дня.

Па-першае, Інстытут мовазнаўства займаецца навуковымі пытаньнямі. Пытаньне прыдуманага правапіснымі «тэарэтыкамі» «правапіснага гандлю» — ненавуковае.

Па-другое, Інстытут мовазнаўства ня мае нейкага чароўнага ўплыву на моўнае ўжываньне — прынамсі, у той яго частцы, дзе ад яго чакаюцца «саступкі». Здаецца, многія людзі думаюць, што ўвесьці ў правапіс нейкае (новае) правіла (рэальна, а не фіктыўна) гэтак жа лёгка, як націснуць кнопку? У дадзенай сытуацыі Інстытут ня можа паўплываць на ўвядзеньне нейкай рысы (мяккага знаку) без ажыцьцяўленьня пэўнай працэдуры і бяз санкцыі як мінімум Міністэрства адукацыі. Зусім ня факт, што пры ажыцьцяўленьні пэўнай працэдуры шалі схіляцца на карысьць мяккага знаку. Хутчэй наадварот. Зрэшты, тут можна абысьціся й без здагадак: глядзі наяўны на сёньня праект Інстытуту мовазнаўства. У гэтым пляне Інстытут, калі ён будзе шчырым, проста ня *мае чаго паабяцаць* «супраціўнаму боку».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У сераду палата прадстаўнікоў прыняла закон «Аб правілах беларускай артаграфіі». Міністар адукацыі А.Радзькоў заявіў: «Закон стане дзейсным сродкам спыненьня практыкі непрадуманага і супрацьзаконнага ўжываньня ў пэрыёдыцы так званай «тарашкевіцы». Закон уступіць у дзеяньне ад 1 верасьня 2010 г.**

Па-трэцяе, паводзіны «нашых мовазнаўцаў» паказваюць, што яны ня надта сур'ёзныя людзі. Яны, бывае, крывяць душой. Пэўная колькасьць іхных «правапісных» заяў — выразна прапагандысцкія. Ці кантралююць яны сытуацыю ў «сваім» лягеры?

Выснова. Ахвотнікі атрымаць «саступкі» ад «афіцыйнага» боку павінныя запрашаць на перамовы больш высокія (прычым ненавуковыя) інстанцыі, чым «акадэмічныя» мовазнаўцы. Акурат па-за межамі навуковых інстытуцый яны могуць дабіцца чаканых «саступак». Гэтым няхай і зоймуцца.

Ня трэба штораз вольна і нявольна ўводзіць людзей у зман, што «правапісная» дыскусія — навуковая.

**P.S.** Тлумачэньне загалоўка. У мяне 14 гадоў таму ўжо быў «правапісны» артыкул пад назвай «Складанае мастацтва кампрамісу».

**P.P.S.** ...Ці ўсе заўважылі: Дубавец у 1993 годзе дапускаў магчымасьць дасягненьня жаданай згоды, калі нават ня будзе *ніякіх* саступак? Ах, гэты *крэатыўны* Дубавец!..

**Сяргей Запрудзкі**

## ДЖЭЦІ

# 10 немаўлят

НАПЯРЭДАДНІ
*(замест прадмовы)*

Вытыркаюцца вежы, нібы цьвікі
З адваротнага боку тонкае дошкі.
Хутка я зразумею, хто ты такі.
Засталося трошкі.

На зьмярканьні крыж узьнёсься ўгару
З надзіманым звонам спадніцы.
Ты зрабіў са мной гэта, і, калі не памру,
Абавязаны ажаніцца.

1. ВЕТЛІВАЯ

Прывітаньне, мама!
Вось якая ты!
Ты, як я, таксама
Геній пекнаты!

Сьвет такі вялікі...
Свой — або чужы?
Нехта цягне рукі...
Ой, дапамажы!..

Я ў сваёй задачцы
Выйшла з кропкі А.
Прывітаньне, мама!
Дай мне малачка!

2. ПАРТЫЗАН

Я не хацеў выходзіць вонкі:
Я патрыёт сваёй старонкі.
І я падумаў: уцяку,
Хоць у кішку, хоць у руку.
Сябе прыклею, прывяжу,
Але — ні кроку за мяжу!
Мяне выкурвалі, як ліса,
Мяне круцілі — ледзь адбіўся,
Мяне, як джына заклiналі,
І выціскалі, і пiналі...
І вось яно — сьвятло ў танэлі...
Перамаглі! — каб вы згарэлі...

3. РАКЕТА

Я так сюды ляцела,
Што абганяла час!
Дашчэнту прапацела,
Раструшчыла абцас...
Ці жарты — зь іншасьвету!
Аж сьвіснула ўвушшу!
Я па жыцьці ракета —
І гэта дакажу!

4. СЬНЯГУРАЧКА

Цёця! Цёця! Цёця!
Знайдзі мяне пад сьнегам!
Дзядзя! Дзядзя!
Машына! Машына!
Я жыла на зорцы —
І нарадзілася ў сьнег.
Верыш? — я не растану ўвесну:
У мяне гарачая кроў,
І я ўмею любіць.

5 І 6. ДВОЕ

Дзьве нагі і дзьве нагі...
Хто з нас першы, хто другі?

Па сакрэце...
(ціха! фельчар!)...
Шшшш...
ДРУГІ
ПАЛЕЗЕ
ПЕРШЫМ!

7. ДЫСЫДЭНТ

Мэдсястра, са звышгрэблівай мінай:
«Посмотри, он ещё и сцыт!»
І скруцілі мне рукі за сьпінай,
А вочы апёк альбуцыд.

8. КЕСАРУ — КЕСАРАВА

Опа! А я ўжо тут!
Сустракаюць афіцыйныя асобы.
А я нават не сабраў рэчы.
Я магу па іх вярнуцца?
А–а, вось і яны! Дзякуй!
Гэта што?
Навошта гэтая гума?
Не, дзякуй, я не галодны.
Стоп–стоп–стоп.
Чаму вы мяне скручваеце?
Чаму спаць?
Я не хачу спаць!
Што вы робіце?
Гэта гвалт!
Паклічце майго адваката!..

9. ЦЯЖКІ

Яны хацелі пачуць, як я плачу,
Яны хацелі пабачыць, як я жыву.
І, каб вырашыць гэтую задачу,
Доўга ламалі галаву
Мне. Абцугамі.
І косткі — маме.
Мая добрая, мая белая мама
Амаль нежывая ляжыць.
Ня бойся: я важу 5 кілаграмаў!
Я заплачу. І мы будзем жыць.

10. ВЫДАТНІЦА

Мне адразу паставілі 10 па АПГАР.
Я прыйшла з усьмешкай на твары,
Павіталася з дактарамі і сёстрамі
(Некаторыя страцілі прытомнасьць),
Пацiснула руку маме,
Выпіла шампанскага з татам.
І першае, што мне зрабілі, —
Гэта вырвалі першародныя зубы.


Восень - то не жарты, браце!
Надта холадна у хаце…
Кветачка пажоўкла,
Ды і мне ня цёпла.
Трэба ў пушчу завітаць
Ды паленцаў назьбіраць.
У цаглянай печы
Запалю агеньчык.
Зайчык захацеў пагрэцца -
Знойдзецца для сябра месца!
Цябе бачыць вельмі рады:
Будзе з кім папіць гарбаты!
http://www.tanakaland.org
Капітан Танака ©

## ВЫСТАВЫ

# Экспрэсія Ніды

**У Музэі сучаснага мастацтва (пр.Скарыны, 47) да 20 лістапада працуе выстава «Экспрэсія Ніды» — працы мастакоў Літвы, Беларусі, Польшчы, Латвіі, Расеі, Украіны і Нямеччыны, прысьвечаныя гэтаму маляўнічаму куточку Літвы.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Майстры польскага плякату

**26 кастрычніка а 17-й гадзіне ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры** адкрываецца выстава «Майстры польскага плякату» з фондаў галерэі Кшыштафа Дыда (Кракаў). На выставе прадстаўленыя 70 плякатаў найбольш вядомых у Польшчы мастакоў, якія працуюць у розных кірунках і стылях. **Выстава будзе працаваць да 18 лістапада.**

### «Сучаснае швэдзкае ювэлірнае мастацтва» ў Віцебску

**У Віцебскім абласным краязнаўчым музэі (вул. Леніна, 36) з 25 кастрычніка да 26 лістапада** працуе выстава «Сучаснае швэдзкае ювэлірнае мастацтва: пашыраная калекцыя». У рамках выставы ў Віцебску, сумесна з Цэнтрам сучаснага мастацтва (г. Віцебск), **24 кастрычніка а 16.00 у музычнай гасьцёўні (вул. Фрунзэ, 11)** адбудзецца сэмінар-прэзэнтацыя сучаснага швэдзкага дызайну.

Экспанаты выставы — вынік працы пятнаццаці мастакоў. Частка экспанатаў зробленая са срэбра, але, акрамя агульнапрынятых матэрыялаў, выкарыстоўваецца таксама дрэва, папера, плястмаса ды сылікон.

### Выстава ў Жодзіне

**Да 31 кастрычніка ў Жодзіне (Смалявіцкі раён Менскай вобласьці), у будынку гарадзкой бібліятэкі** працуе мастацкая выстава «Жодзінцы», прысьвечаная 365-годзьдзю першае ўзгадкі населенага пункту ў дакумэнтах пад назвай Багуславава Поле.

У экспазыцыі 20 аўтараў дэманструюць творы жывапісу, графікі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод іх — пэйзажы з гістарычнымі краявідамі і помнікамі архітэктуры, натурморты, сюжэтныя работы і партрэты.

На выставе Аляксей Марачкін прадставіў партрэт ваеннага і дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага Багуслава Радзівіла — заснавальніка гораду Жодзіна.

## ІМПРЭЗЫ

### Жыбуль і Бурлак у БАМе

**26 кастрычніка у вялікай залі Беларускай акадэміі музыкі** пройдзе канцэрт у рамках міжнароднага фэстывалю «Дыялёгі». У першым аддзяленьні прагучыць музыка сучасных кампазытараў у выкананьні аўтараў, а ў 2-м аддзяленьні — камэрны ансамбаль «Рацыянальная дыета» з удзелам паэтаў Віктара Жыбуля і Веры Бурлак. **Пачатак а 19-й.** Уваход вольны.

### «Дзеяслову» — 5 гадоў!

**30 кастрычніка** адбудзецца юбілейная вечарына з удзелам выдаўцоў, а таксама сяброў і аўтараў выданьня. Бяруць удзел: Генадзь Бураўкін, Сяргей Законьнікаў, Уладзімер Някляеў, Вольга Іпатава, Віктар Казько, Анатоль Кудравец, Уладзімер Арлоў, Валянціна Аксак, Леанід Дранько-Майсюк, Алесь Камоцкі і інш. вядомыя паэты і барды.

У праграме вечарыны — уганараваньне ляўрэатаў традыцыйнай штогадовай прэміі часопісу **«Залаты апостраф»**, а таксама прэзэнтацыя 30-га нумару і **дзьвюх новых кніг** сэрыі «Бібліятэчка часопісу «Дзеяслоў» (аўтары Анатоль Кудравец і Сяргей Дубавец).

**Месца ДЗЕяньня: Гістарычная майстроўня (Менск, вул. Сухая, 25, раён ст. мэтро «Фрунзенская»). Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Ахвяры і карнікі

**26 кастрычніка а 18-й гадзіне на Сядзібе БНФ** адбудзецца **прэзэнтацыя кнігі Леаніда Маракова** «Ахвяры і карнікі». Ласкава запрашаем!

### «Дух — гэта, людзі, Я!..»

Пад такім назовам **27 кастрычніка ў Гарошкаве** адбудзецца сьвята паэзіі ў гонар Дня народзінаў паэта Анатоля Сыса.

У імпрэзе бяруць удзел родныя і сябры паэта, а таксама: Ніл Гілевіч, Леанід Дранько-Майсюк, Барыс Пятровіч, Эдуард Акулін, Міхась Скобла, Сяржук Сыс, Ларыса Раманава, Андрэй Мельнікаў і іншыя паэты і барды.

Запрашаюцца ўсе, каму дарагі несьмяротны Дух беларускай паэзіі і песьні.

**Пачатак імпрэзы — а 14 гадзіне на падворку хаты Анатоля Сыса (в.Гарошкаў Рэчыцкага раёну).** Праезд аўтобусамі: Менск—Рэчыца, Рэчыца—Гарошкаў. Кантактны тэлефон: (029) 768-56-14.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**26 (пт)** — «Сны аб Беларусі».
**27 (сб)** — «Чычыкаў».
*малая сцэна*
**28 (ндз)** — «Баляда пра каханьне».
**29 (пн)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

### Тэатар юнага гледача

**26 (пт)** — «Палачанка».
**27 (сб)** — «Дарога на Віфлеем».
**27 (сб), 28 (ндз)** — «Бармалей».
**27 (сб)** — «Тарас на Парнасе».
**28 (ндз)** — «Мятлік».
**28 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».

### Тэатар беларускай драматургіі

**26 (пт)** — «Іванаў».
**27 (сб)** — «Казачкі з куфэрачка».
**27 (сб)** — «Сёстры Псыхеі».
**28 (ндз)** — «Воўк-мараплавец».
**28 (ндз)** — «Ганна ў тропіках».
**30 (аўт)** — «Валянціна».
**31 (ср)** — «Валеры Анісенка. Прызнаньне…»

## СЭМІНАР

### Музычна-гістарычны сэмінар

**2 лістапада а18-й гадзіне** — сэмінар з удзелам музычнага прадусара Арыны Вележ, а таксама кіраўніка гурту «Стары Ольса» Зьмітра Сасноўскага. Тэмы дакладаў:

1. Іканаграфія беларускіх інструмэнтаў XV—XVII стст.

— Выявы інструмэнтаў Беларусі паводле абразоў, фрэсак, кніжных мініятур, паводле вынікаў пошукаў 2007 году. Выкладчык — Зьміцер Сасноўскі.

2. Беларускі гарадзкі фальклёр.

— Датаваны беларускі фальклёр.

— Беларускі фальклор у нотных зборах XVII— XIX стст.

Выкладчык — Арына Вележ.

Уваход вольны.

**Месца: ЦПП «Маяк» Трэці паверх, 21 пакой (завулак Палявы 2а, ад Вакзалу 5, 20 трал.)**

Дадатковая інфармацыя: minsk_news.livejournal.com




**КІНО НА ВЫХОДНЫЯ**

# «Жыцьцё ў ружовым колеры»

Фільм пра Эдыт Піяф.

**Жыцьцё ў ружовым колеры** (La Môme)

Францыя — Вялікабрытанія — Чэхія, 2007, каляровы, 140 хв.

**Рэжысэр:** Аліўе Даан

**Ролі выконваюць:** Мэрыён Кацір, Сыльві Тэсьцю, Эманюэль Сэнье, Паскаль Грэгары, Жан-Поль Руў, Жэрар Дэпард'ё, Клятыльда Куаро

**Жанр:** Біяграфічная драма

**Адзнака:** 7,5 з 10

Сьпявачка Эдыт Піяф, якая нарадзілася ў трушчобах, узьнялася на падмосткі самых прэстыжных заляў. Ейнае жыцьцё — гэта любоў, і гэта песьні, якія дасюль зачароўваюць сэрцы.

Біяграфічныя драмы звычайна павярхоўныя, насычаныя скандальнымі падрабязнасьцямі з жыцьця знакамітасьцяў — і нічога не гавораць пра душу й творчасьць. Іншыя кінабіяграфіі акадэмічна-напышлівыя, манумэнтальныя, нудныя.

Карціна Аліўе Даана шчасьліва пазбаўленая гэтых недахопаў. Жыцьцё слыннай сьпявачкі — гэта голас ейнай душы, стракатая атмасфэра Парыжу, любоў, барацьба й дзіцячая вера, мужнасьць і чалавечнасьць сэрца — і наіўна-пяшчотны гратэск жэстаў.

У рэжысэра Даана былі правальныя стужкі (як «Барвовыя рэкі-2»), былі выкшталцоныя кінапрактыкаваньні («Малое пальчанё»), але біяграфія Эдыт Піяф — гэта моцная й праўдзівая драма, якая працінае да сьлёз.

Актрыса Мэрыён Кацір зьмяніла фрызуру, згаліла бровы — і на грым патрабавалася да пяці (!) гадзінаў. Кацір ня вельмі вонкава падобная на Піяф, але яна паказала галоўнае — душу акторкі, ейныя пачуцьці, любоў, няшчасьце й радасьць, упартасьць і весялосьць.

Дзьвюхгадзінная карціна праносіцца на адным подыху, на адным сьпеве — і яшчэ доўга будуць гучаць у сэрцы песьні Піяф.

Фільм дэманструецца ў кінатэатры «Перамога» на мове арыгіналу — з расейскімі субтытрамі.

А ў «Доме кіно» з чацьвярга па нядзелю ў межах «Канаманіі» дэманструецца стужка Эміра Кустурыцы «Запавет».

**Андрэй Расінскі**

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі


**Пэнсія мары.** Беларусы сасьпелі да пэнсійнай рэформы. Піша Алесь Кудрыцкі. .......... 2

**У Расеі безь пераменаў.** Незалежна ад таго, японскую ці мэксыканскую мадэль палітычнай сыстэмы выбралі пуцінцы, Масква ня зьменіць палітыкі ў Беларусі. Піша Андрэй Ляховіч .......... 22

**Алесь Мазанік:** «Гаворыш па-беларуску? Табе зьніжка!» .......... 24

**Беларуская спэцыфіка тэлегульняў.** Арганізатары «Аднаго супраць усіх» пакуль не зразумелі, што пытаньні на беларускую тэматыку — іх залаты фонд. Піша Ягор Марціновіч .. 26

**Складанае мастацтва кампрамісу — 2.** У працяг дыскусіі аб правапісу. Піша Сяргей Запрудзкі .......... 26


## КАЛІ Б...

**...ягоныя словы былі праўдай: «Габрэі ня надта дбаюць, каб трава была падкошаная, як у Маскве, у расейцаў, беларусаў».**




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

Трэнэр зборнай Беларусі Штангэ: «Глеб, ізноў заблукаў? Ты ж па сваіх варотах лупіш».

## ГУМАР

# З пачутага

* * *

— Ды надаела ўжо гэтая сям'я! Цэлы дзень каструлі, каструлі. На рабоце зь людзямі хоць атдыхнеш!

*(з ранішняй прадмовы ў рабочым гардэробе)*

* * *

На беларускім радыё гучыць інтэрвію са шматдзетнай маці.

Вядучая: «Скажыце, а чым Вам спадабаўся гэты чалавек? Чаму менавіта ён стаў Вашым мужам, бацькам Вашых дзяцей?»

Маці: «А болей ніхто ня сватаўся».

В.: «Зараз на самым высокім узроўні надаецца ўвага падтрымцы шматдзетнай сям'і. А хто дапамагае Вам?»

М.: «Мой бацька. Ніколі не адмовіцца дапамагчы па гаспадарцы, парэзаць дровы».

В.: «Вось некаторыя кажуць пра шматдзетных — навошта пладзіць жабракоў? Вы зь імі згодныя?»

М.: «Не, я не лічу, што мае дзеці жабракі. Вунь колькі адзеньня пааддавалі!»

В.: «А ці ёсьць у Вашых дзяцей пэрспэктывы ў роднай вёсцы?»

М.: «Былі б грошы — былі б і пэрспэктывы».

**Сабрала Т.Барысік, Магілёў**



# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыцеся дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У в. Кленіках, Грод. губ. Бельскага павету**

Гадоў 6 ці 7 таму назад валасны сход прыгаворам пастанавіў адпусьціць 20 руб. на ўстройства бясплатнай кнігарні, але гэты прыгавор не прыведзен у споўненьне. Тым часам у гэтым летку адкрылася кнігарня Паўлянкова. Ад гэтай кнігарні падалі прашэньне валасному сходу, каб ён пацьвярдзіў гэты прыгавор і адпусьціў 20 руб. на кнігарню Паўленкова. Але ж ведама, што ў нас часта ўсім сходам варочаюць адзін ці два жулікаватых мужыкоў. За гарэлку які-небудзь Піліп з Ракавіч на сходзе ваюе проці старшыны, кажа аб задзіраньні насоў валаснога начальства, а другі раз гэты самы Піліп стаць на сходзе проці кнігарні. Дык вот такія заправілы пакіравалі так сход, што і тых адпушчаных 20 руб. не ўцьвярдзілі.

**Халімон з-пад пушчы**

**«Наша Ніва». №31. 1907**


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2239.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 24.10.2007.

Замова № 5830.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.